ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б. ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ

№ 33 | Серада, 11-га лютага 1931 г. | № 33

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І У РАЁНАХ 3 К.

Редакцыя: Палац працы, 3-ці паверх, пак. № 39, 40, 41, 42. Тэлеф. агульны 2-95, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і к-ры 72.

Падпісная цана у месяц 60 кап. Плата за абвесткі: За радок нэтыту . . . 25 кап. Для іншагародніх . . . 40 кап. Пры шматразовым друкаваньні скідка на згодзе.

Год выданьня 14-ты.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР

Сёньня, 11-га лютага, роўна а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Белдзяржтэатру адбудзецца вялікі інтэрнацыянальны вечар з дакладам аб мопраўскай рабоце. На вечары выступяць былыя кіраўнікі «Беларускай грамады» тт. Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсевіч. Пасьля будзе пастаноўка п'есы „Гута".

Прапануецца ўсім сэкратаром мопраўскіх ячэек атрымаць білеты ў гаркоме МОПР'у, забясьпечыўшы 100 проц. яўку на вечар.

Прэзыдыум гаркому МОПР.

К. ГЕЙ

Напярэдадні другой бальшавіцкай вясны

У сваім дакладзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б) т. Сталін, закранаючы пытаньне аб труднасьцях нашага росту, падкрэсьліў, што яны выклікаюцца ня так званымі «аб'ектыўнымі прычынамі», а што зьяўляюцца пытаньнямі клясавага парадку, што яны вынікаюць у рэзультаце супраціўленьня клясава-варожых элемэнтаў. Аб тым, што гэта імення так, мы можам прасачыць ня толькі ў рабоце па разгортваньні прамысловага будаўніцтва, а і ў рабоце па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Шкодніцтва і супраціўленьне кулацтва—вось галоўныя крыніцы нашых труднасьцяй. І трэба сказаць, што мясцовыя парт-арганізацыі не заўсёды ўмеюць, як належыць, мабілізаваць масы на перамаганьне гэтага супраціўленьня кулацтва.

Палітыка партыі ў адносінах кулацтва вызначаецца лёзунгам «ліквідацыя кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі». Гэта значыць, што ў тых раёнах і мясцовасьцях, дзе процант калектывізацыі складае больш паловы бядняцка-сераднякіх гаспадарак, мы будзем непасрэдна праводзіць ліквідацыю кулацтва, як клясы. Гэта значыць, што там, дзе суцэльная калектывізацыя яшчэ не дасягнута, мы праводзім палітыку абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый і выцісканьня кулацтва, але ўжо пад кутом погляду непасрэднай падрыхтоўкі да ліквідацыі кулацтва, як клясы. З гэтых агульных палажэньняў трэба выходзіць і пры давядзеньні цьвёрдых заданьняў да кулакіх і заможных гаспадарак. Даводзячы цьвёрдыя заданьні да кулака і заможніка, мы ўжываем такія меры спагнаньня, якія даюць нам права канфіскаваць усю маемасьць у кулака, пазбавіць яго права карыстацца зямлёю і ўсімі сродкамі вытворчасьці. У адносінах да заможных гаспадарак мы, зразумела, меры спагнаньня ўжываем іншыя, чым да кулацкіх гаспадарак (штрафныя, судовыя) і г. д.

У якой ступені раёны выкарыстоўваюць гэтыя вялізарныя правы?

На гэта пытаньне трэба адказаць адмоўна. Раёны свае правы скарыстоўваюць у вельмі нізкай ступені. Асноўнай прычынай нашых труднасьцяй у галіне збожжазагатовак, льнязагатовак, десазагатовак і ў галіне правядзеньня асноўных мерапрыемстваў партыі на вёсцы зьяўляецца тое, што рад раённых арганізацый на здолеў паставіць пытаньне аб кулаку так, як паказвала партыя.

Рашаючым момантам для пасьпяховасьці работы па выкананьні асноўных палітычна-гаспадарчых задач партыі на вёсцы зьяўляецца палітыка ньвёрдых заданьняў кулацкім і заможным гаспадаркам. Як жа гэты сродак скарыстоўвалі раённыя арганізацыі і ўстановы? Па пытаньні льнязагатовак мы імкнуліся праверыць наколькі раёны выкарысталі данныя ім правы. На дзьве тэлеграмы ЦК па гэтым пытаньні 30 раёнаў зусім не далі вестак, або далі іх далёка нездавальняючыя. Безумоўна, што не адказалі тыя раёны, у якіх на гэтым пытаньні не знайшлося чаго адказваць. І таму адсутнасьць адказу з гэтых раёнаў мы павінны разглядаць, як імкненьне прыкрыць тое, што палітыка ў адносінах да кулака на практыцы праводзіцца ў гэтых раёнах нездавальняюча.

Раёны ў колькасьці 32 далі вестк і няпоўныя і толькі 38 раёнаў далі вестк і здавальняючыя. І вось в гэтых данных відаць, што на кулацка-заможныя гаспадаркі ў некаторых раёнах накладалася 0,7 проц. 0,8 проц., 0,9 проц. агульнага размеру загатовак. Такое імення становішча ў Асьвейскім, Ветрынскім, Крупскім і інш. раёнах. І гэта пры умовах, калі ў раёне 5—7 проц. кулацка-заможных гаспадарак.

Як-жа раёны дабіваліся таго, каб кулацка заможныя гаспадаркі выканалі данныя ім заданьні? Лічбы гавораць аб тым, што гэта выкананьне ў радзе раёнаў недапушчальна дрэннае. Так, у Бялыніцкім раёне з кулацка-заможных гаспадарак данныя ім заданьні спагнаны толькі на 7,2 проц., у Расонскім раёне—на 10 проц., у Асіпавіцкім—11,6 проц. і г. д. Толькі ў 16 раёнах з кулацка-заможных гаспадарак заданьні спагнаны больш, як на 50 проц. Пры такім становішчы, бязумоўна, загатоўкі пасьпяхова праходзіць ня будуць. Раёны не змаглі ўхавіцца за асноўнае зьвяно. У значнай частцы раёнаў цьвёрдыя заданьні зусім не даведзены да кулака і больш таго, у раёне сёй-той нават з членаў партыі імкнецца давесьці, што ў іх зусім няма кулакоў. Там, дзе кулак абкладзены, ён абкладзен не выстарчальна, а там, дзе і абкладзен пасапраўднаму, заданьне з кулака не спагнаецца. Напрыклад, у Пятрыкоўскім раёне было абкладзена ўсяго 3 гаспадарак. Потым пашукалі і знайшлі 40 буйных кулацкіх гаспадарак (былых паўабшарнікаў, арандатараў маёнткаў і г. д.).

У рэзультаце такой «работы» па мабілізацыі мас на ўзмацненьне націску на кулака, калектывізацыя ў гэтым раёне ідзе самацёкам. Загатоўкі бульбы выкананы толькі на 26 проц., збожжазагатоўкі—на 46 проц. і мабілізацыя сродкаў—на 20 проц. Усе гэтыя паказальнікі надзвычайна нізкія і яны характарызуюць вельмі выразна дзейнасьць раённай парт-арганізацыі.

Выкананьне нашых чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній на вёсцы знаходзіцца ў простай залежнасьці ад таго, наколькі раённыя камітэты партыі, наколькі парт'ячэйкі змаглі правесьці правільную палітыку ў адносінах да кулацкай і заможнай верхавіны вёскі. Наша змаганьне з клясавым ворагам на вёсцы адбіваецца ня толькі на ходзе загатовак, але мае і свае непасрэдныя адносіны да калектывізацыі і выклікаў веснавой пасеўнай кампаніі. У тых раёнах, дзе пануюць апартуністычныя настроі, якія не даюць магчымасьці партыйнай арганізацыі падыйсьці правільна да змаганьня з кулацкімі элемэнтамі на вёсцы, тыя раёны праваляць і калектывізацыю і веснавую сяўбу.

У пытаньнях калектывізацыі, якая павінна заняць цэнтральнае месца ў нашай рабоце, мы сустракаемся з шырока распаўсюджанымі апартуністычнымі настроямі на мясцох. Апрача таго, што асобныя рай партарганізацыі ня могуць спраўляцца на фронце змаганьня з кулаком, у выніку леташніх перагібаў у радох асобных партарганізацый склаліся такія настроі: «Калі возьмешся за калектывізацыю, дык можна паўтарыць памылкі і перагібы мінулага году». Апынуўшыся ў палоне такіх настрояў, таварышы сядзяць, чагосьці чакаюць, не працуюць і спадзяюцца на тое, што бядняцка-сераднякія масы самі калектывізуюцца. На прыкладах некаторых раёнаў мы можам вельмі выразна бачыць, як «левыя» загібы мінулага году ператвараюцца зараз у апартуністычную пасыўнасьць. Гарадоцкі раён належыў да ліку тых, якія ў эпоху «головокружения от успехов» калектывізаваўся на... 100,6 проц. Зараз гэта адзін з адсталых раёнаў у рэспубліцы па калектывізацыі, там толькі 6—7 проц. бядняцка сераднякіх гаспадарак ахоплена калгасамі. У гэтым раёне, дзе перагібаў у мінулым годзе было больш, чым у якім-небудзь іншым, зараз найбольш выразна праяўлена права-апартуністычная стаўка на самацёк, баязьнь падыйсьці шчыльна да разгортваньня калектывізацыі. Прыклад Гарадоцкага раёну пацьвярджае, наколькі права-апартуністычныя ўхілы цесна ўжываюцца з «левымі» загібамі. Тыя, хто ў мінулым годзе дапусьціў «левыя» загібы, сёлета нічога ня робяць, тармозяць справу разгортваньня калектывізацыі.

Права-апартуністычныя адносіны да калгаснага будаўніцтва зьяўляюцца найбольш распаўсюджанай хваробай, якая вельмі ярка кідаецца ў вочы. Аднак, у асобных выпадках мы сустракаемся і з рэцыдывамі «левых» загібаў у рабоце мясцовых партарганізацый.

Гэтыя перагібы перш за ўсё выяўляюцца ў ператвараньні калгасаў у саўгасы і прыгарадныя гаспадаркі. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б не адзін раз даваў зусім выразную дырэктыву раённым арганізацыям па гэтым пытаньні. Аднак, ня гледзячы на гэта і наперакор гэтым дырэктывам, да апошняга часу мы маем выпадкі, калі калгасы «добраахвотна» пераводзіліся ў саўгасы і прыгарадныя гаспадаркі. Прычым, гэта «добраахвотнасьць» была такой, што калгаснікі скардзіліся ў Калгасцэнтр, ЦК КП(б)Б і інш. цэнтральныя органы і прасілі пазбавіць гэтага пераводу іх гаспадаркі «на вышэйшую сацыялістычную ступень».

Для таго, каб развіць і дабіцца больш шпаркх тэмпаў калектывізацыі, а гэтага мы павінны дабіцца, бо сучасны ход разгортваньня калгаснага руху нас не здавальняе, нам трэба: па першае, правесьці правільную палітыку ў адносінах да кулацкіх элемэнтаў на вёсцы; па-другое, перамагчы і выявіць апартуністычныя настроі ў радох нашых вясковых партарганізацый (стаўка на самацёк);

па-трэцяе, трэба паставіць у парадак дня пытаньне барацьбы за палепшэньне якасьці калгаснае работы, за павышэньне і ўмацаваньне існуючых калгасаў.

Ня гледзячы на ўсе рагаткі, кулак ўсё-такі праляз ць у калгасы. У Барысаўшчыне ў калгасах выяўлена 85 проц. кулацкіх гаспадарак, якія былі раскулачаны ў раёне. У іншых раёнах калгасы таксама вельмі засьмечаны. Цэнтральны Камітэт КП(б)Б прыняў пастановы аб тым, каб правесьці чыстку калгасаў. Гэта чыстка ўжо праводзіцца.

Надзвычай важнае і рашаючае значэньне ў сэнсе павышэньня якасьці калгаснае работы мае пытаньне разьмеркаваньня ўраджаю. У радзе раёнаў да вырашэньня гэтага пытаньня яшчэ шчыльна не падыйшлі. У радзе раёнаў разьмеркаваньне ўраджаю не ўвязалі з пытаньнем арганізацыі працы. У радзе раёнаў яшчэ не зразумелі таго, што правільнае разьмеркаваньне ўраджаю стварае магчымасьці для таго, каб правільна арганізаваць працу ў калгасах. Арганізаваць правільна працу ў калгасе адзай толькі агітацыяй і заклікам да сьвядомых адносін да сваіх абавязкаў ніяк ня ўдасца. Праца можа быць арганізавана правільна толькі правільна пастаўленым разьмеркаваньнем ураджаю. Мы павінны падкрэсьліць, што калгасы БССР, як правіла, вельмі адсталі з разьмеркаваньнем ураджаю ад калгасаў іншых рэспублік і абласьцей СССР. У радзе раёнаў нават зараз, у лютым месяцы, яшчэ не разьмеркован ураджай. У Сьвіслацкім, напрыклад, раёне з 27 калгасаў ураджай разьмеркован толькі ў 7, а ў астатніх — нават ня складзен вучот прыбытку. Там-жа, дзе разьмеркаваньне ўжо прайшло, зьвяртае на сябе ўвагу тое, што далёка ня ўсюды пры разьмеркаваньні ўраджаю прытрымліваліся прынцыпу калгаснага прынцыпу. У Гораўскім раёне вылучылі трэцюю частку ўсіх прыбыткаў для разьмеркаваньня паводле ядоцкага прынцыпу. У Горацкім раёне па 22 калгасах ¼ частку разьмеркавалі таксама паводле ядоцкага прынцыпу. Ёсьць рад раёнаў, якія праводзяць мешаны прынцып—разьмяркоўваюць ураджай і па працы і па едакох.

ЦК УсеКП(б) лічыць, што зараз рашаючым для ўмацаваньня калгасаў і для далейшага разгортваньня калектывізацыі зьяўляецца цьвёрдае, пасьлядоўнае і няўхільнае правядзеньне прынцыпу працоўнага разьмеркаваньня ўраджаю. І калі мы гэтага прынцыпу ня будзем прытрымлівацца, калі мы дапусьцім, каб прыхільнікі ядоцкіх і спажывецкіх настрояў у калгасах сарвалі гэты прынцып, калі мы ў далейшым дапусьцім, каб ⅛ ці ¼ частка ўраджаю разьмяркоўвалася па едакох, то тады створацца такія перашкоды ў справе правільнай арганізацыі працы ў калгасах і павышэньня гаспадарчага ўзроўню калгасаў, што мы з іх у другім годзе існаваньня нашых маладых калгасаў выйдзем з вельмі вялікімі затрудненьнямі. У калгасах разьмеркаваньне ўраджаю паводле працоўнага прынцыпу зьяўляецца зараз рашаючым зьвяном, за якое трэба ўхапіцца калгасам каб рушыць наперад справу калектывізацыі. І калі мы іх пацягнем як належыць—цьвёрда правядзём прынцып працоўнага дня пры разьмеркаваньні ўраджаю, то мы створым такія ўмовы, пры якіх і спэцыялізацыя і правядзеньне іншых мерапрыемстваў у калгасе пойдуць лягчэй. Пры такім працоўным прынцыпе разьмеркаваньня ўраджаю ствараецца зацікаўленасьць калгасьнікаў да павышэньня прадукцыйнасьці працы, ствараецца зацікаўленасьць у спэцыялізацыі калгасаў (разгортваньне жывёлагадоўлі, тэхнічных культур, пашырэньне кармовай базы і г. д.). Пакуль-жа разьмяркоўваецца ўраджай паводле ядоцкага прынцыпу, зацікаўленасьць калгасьнікаў абмяжоўваецца тым, каб «толькі як-неб дзь прахарчвацца». А як толькі мы пярэйдзем і пачнем пасьлядоўна праводзіць працоўны прынцып у разьмяркаваньні ўраджаю, зацікаўленасьць калгасьнікаў да гаспадарчага жыцьця максымальна павысіцца. Гэта трэба добра замацаваць для таго, каб выправіць тое, што яшчэ можна выправіць, каб у тых калгасах, якія зьбіраюцца разьмяркоўваць ураджай, пасьлядоўна праводзіць працоўны прынцып.

Нельга ня спыніцца на пытаньні безгаспадарчасьці ў калгасах. Гэта цеская зьвязана з двума папярэднімі пытаньнямі становішча ў калгасах. Трэба сказаць, што вельмі часта прыход іцца сустракацца з фактамі самай злачыннай безгаспадарчасьці ў калгасах. Прыкладам можа служыць калгас Ларынаўка (Аршанскі раён). Там ёсьць каля 20 работнікаў, якія, будучы вызвалены ад работы непасрэдна ў гаспадарцы калгасу, жывуць за кошт калгасу. Гэта нікуды ня варта. Злачыннай безгаспадарчасьцю, злачыннымі адносінамі да прадуктаў у калгасах — стракаціць уся гісторыя практычнай работы асобных калгасаў.

Некалькі слоў адносна падрыхтоўкі да вясновай пасеўнай кампаніі. 74 раёны апрацтаставалі заданьне НКЗему па пашырэньні пасеўнай плошчы, дамагаючыся больш нізкіх для сябе заданьняў. Гэтаму зьявішчу мы павінны даць палітычную ацэнку. Што значыць, што большасьць раёнаў пратэстуюць супроць пашырэньня пасеўнай плошчы ў тых памерах, якія намечаны Саюзным урадам і ўрадам БССР. Гэта значыць, што ў раёнах не разумеюць тых задач, якія перад намі стаяць напярэдадні вясновай сяўбы, што яны не разумеюць тых мэтадаў і шляхоў, праз якія яны могуць ажыцьцявіць заданьне, якое на іх ускладзена. Палітычна гэта нельга інакш кваліфікаваць, як праяву праваапартуністычнай практыкі.

Заданьні, вызначаныя плянамі, выканаць можна і неабходна за кошт скарачэньня папараў за кошт узворваньня новых зямель. Гэтыя заданьні можна выканаць у кожным раёне. Спрэчкі могуць быць толькі аб некаторых дэталях. Апіраючыся на сацыялістычны сэктар, апіраючыся на ўмацаваньне плянавага пачатку ў індывідуальным сэктары, мы павінны забясьпечыць шляхам цэлага раду мерапрыемстваў выкананьне сяўбы.

Партыйныя арганізацыі змогуць выканаць задачы па калектывізацыі, задачы па правядзеньні вясновай пасеўнай кампаніі толькі пры тэй умове, калі будуць весьці бязьлітаснае змаганьне супроць праяў праваапартуністычнай практыкі, супроць усякай стаўкі на самацёк. Адначасова ні на хвіліну не павінна быць аслаблена змаганьне супроць усякіх «лявацкіх» рэцыдываў, якія граюць на руку праваму апартунізму і падрываюць справу калгаснага будаўніцтва. Толькі ўзмацнёная мабілізацыя шырокіх мас калгасьнікаў і батрацка бедняцкіх і сераднякіх мас аднаасобнікаў, толькі праз узмацненьне націску на кулацтва партыйныя арганізацыі забясьпечаць посьпехі ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны, якая зьяўляецца рашаючым этапам у выкананьні праграмы партыі па калектывізацыі на трэці рашаючы год пяцігодкі.

ГАРСАВЕТ—ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

(НА ПЕРШЫМ ПЛЕНУМЕ НОВАГА СКЛАДУ ГАРСАВЕТУ)

9-га лютага ў цырку 3 удзелам партыйнага прафэсіянальнага і чырвонаармейскага актыву адкрыўся першы пленум уноў абранага гарсавету. З дакладам аб выніках справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету выступіў т. Каваленка.

Дакладчык спыніўся на значэньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету і на задачах, якія стаяць перад новым складам гарсавету.

У справаздачна-перавыбарчай кампаніі рабочыя і працоўныя масы гораду прымалі актыўны ўдзел і яўка на сходы месцамі даходзіла да 100 проц., сярэдні процант яўкі абіральнікаў складае 82,6 проц. 300 лепшых рабочых—ударнікаў за час справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету падалі заявы аб прыёме ў партыю, к наказу дадзена каля 3 х тысяч прапаноў і за гэты тэрмін мы маем 2 тысячы новых ударнікаў. Побач з гэтым т. Каваленка застанавіўся і на меўшых месца недахопах.

Пасьля дакляда з прывітаньнем ад гарнізону Вішебску выступіў, спатканы бурнымі воплескамі, камандзір т. Ланціонаў, перадаўшы ад імя гарнізону пралетарыям Вішебску чырвонаармейскае прывітаньне. Чырвоная армія моцна, палітычна і маральна здарова, байцы гарнізону разгарнулі сацыяборніцтва і ўдарніцтва і на заклік партыі тысячамі ўступаюць у партыю і камсамол. Гэта кажа аб тым,—працягвае тав. Ланціонаў,—што лінія партыі верная.

Пасьля выступленьня т. Ланціонава, работніцы панчошнай і новай шэйнай фабрык рапартавалі пленуму аб уключэньні ў „рапарт мільёнаў" і аб узятых на сябе абавязацельствах. На пленуме выступіў старшыня ВСНГБ т. Грысевіч, які гаварыў аб маючыхся вялікіх дасягненьнях на фронце пабудовы сацыялізму і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ен, побач з гэтым, датыкнуўся маючыхся недахопаў у выкананьні прамфінпляну некаторымі прадпрыемствамі і заклікаў уноў абраны гарсавет максімум увагі ўдзяліць пытаньню выкананьня прамфінпляну і калектывізацыі вёскі.

З адказным словам выступіў т. Рубін. Пад канец адбыліся выбары прэзыдыуму новага складу гарсавету.

Склад прэзыдыуму Гарсавету.

Каралёў.
Каменштэйн,
Пракопенка.
Чычэраў.
Вензель.
Бергман.
Лакціонаў.
Скробун.
Азарэнкава.
Крыгой.
Цукерман.
Казлоў.
Сухаручкін.
Паўленка (МБВ чыг.).
Яфімаў («Чырвоны Металіст»).
Эстрына (швэйная).
Касёкін („Дзьвіна").
Провад (панчошная).
Шурвей («Ленерта»).

Кандыдаты:

Гендзіна (пост. нарадзьветы).
Граеўская (аховы здароўя).
Фальковіч (ЦРК).

Мандатная камісія:

Рагозін (будаўнік).
Багданаў (Гарсавет).
Левінтэў («Чырвоны Металіст»).
Пракофьеў (Н. артполк).
Дваросн (рэдакцыя газэты).

Дэлегаты на X усебеларускі зьезд саветаў

Чарвякоў.
Арэнштам.
Гурэвіч.
Каменштэйн.
Чычэраў.
Каралёў.
Бергман.
Каваленка.
Цукерман.
Гендзіна.
Каменштэйн (Гарсавет).
Вензель.
Казлоў.
Рубін.
Ігнатовіч.
Сухаручкін.
Лакціонаў.
Вайнэр.
Скробун.
Новаўзэ.
Подлас.
Міхайлаў.
Хрол (МБВ).
Івашкевіч.
Калістава („Дзьвіна").
Савіцкая (швэйная).
Батхан (панчошная).
Доозьнікаў (ф-ка Ленерта)
Сігуржынскі („Чырвоны Металіст").
Рагозін (будаўнік).

КАРЭННАЙ ПЕРАБУДОВАЙ ПРАЦЫ

ЗАВЯРШЫЦЬ ПАВАРОТ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Фабзаўмясцкомы павінны стаць канкрэтнымі кіраўнікамі вытворчай актыўнасьці мас

Прафсаюзы на новым шляху

Грандыёзны плян вялікіх работ, намечаных на трэці рашаючы год пяцігодкі, забясьпечваючы далейшы бальшавіцкі наступ па ўсяму фронту, патрабуе мабілізацыі ўсіх сіл пралетарыяту на пасьпяховае выкананьне гэтага плану. Сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі, на перамогу ўсіх цяжкасьцяй, зьвязаных з буйным ростам сацбудаўніцтва.

Адсюль тыя вялізарныя задачы, якія стаяць перад прафсаюзамі як найбуйнейшай масавай арганізацыі пралетарыяту, у галіне далейшай перабудовы работы ўсяго апарату, усіх прафсаюзных зьвяньняў зьверху да нізу. Прафсаюзы на данным этапе ў абставіны ўсё ўзрастаючай актыўнасьці рабочае клясы, уцягненьня ў сацбудаўніцтва мільёнаў новых рабочых, — павінны зьяўляцца сапраўднымі арган затарамі актыўнасьці і творчай ініцыятывы рабочае масы, вакол пытаньняў вытворчасьці.

Бязумоўна, пасьля зьмены старога апартуністычнага кіраўніцтва УсеЦСПС, прафсаюзы маюць ужо значныя дасягненьні ў барацьбе з апартунізмам, трэд'юніанізмам, цэхаўшчынай і са ўсялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, а таксама ў галіне перабудовы сваёй работы «тварам да вытворчасьці». Але ж гэтыя дасягненьні зьяўляюцца толькі першымі крокамі ў перабудове прафсаюзнай работы і ні ў якім разе не адпавядаюць поўнасьцю задачам, пастаўленым ленінскай камуністычнай партыяй перад прафсаюзамі ў рэканструкцыйны перыяд.

XVI зьезд УсеКП(б), ухваляючы лінію новага кіраўніцтва УсеЦСПС, адначасова рашуча паставіў перад прафсаюзамі задачу працягваньня і завяршэньня павароту прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, да актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялістычнай гаспадаркі, да перамогі дробна-буржуазных шатаньняў унутры адсталых колаў рабочае клясы цясьнейшым чынам увязваючы гэтую работу з палепшаньнем рабочага забясьпячэньня, аховай працы, барацьбой з бюракратызмам у дзяржаўных і гаспадарчых органах і прафапарату.

Вось чаму зусім своечасова паставлена пытаньне на V пленуме УсеЦСПС аб далейшым палепшаньні работы прафсаюзаў. Рашэньні гэтага пленуму павінны зьявіцца новым пераломным этапам у прафруху СССР. Адно з галоўных рашэньняў пленуму гэта — **разубуйненьне прафсаюзаў.**

Існуючая структура прафсаюзаў не забясьпечвае поўнага актыўнага ўдзелу ў вытворчым жыцьці па ўсіх галінах сацыялістычнай прамысловасьці і будаўніцтва і не дае магчымасьці своечасова ўзглавіць растучую творчую ініцыятыву рабочае масы.

Прыкладам можа служыць і віцебская сапраўднасьць, калі саюз будаўнікоў зьвязан амаль што з 10-ю розными гаспадарчымі аб'яднаньнямі, як-та: калгасоўд, белдзяржбуд, ЦРК, будкантора, адміністрацыя чугункі, дарбуд, прамтрэст, камтрэст і інш. Пры гэткай структуры саюзныя арганізацыі ня маюць ніякай магчымасьці ўдзельнічаць у плянаваньні будаўніцтва і ў поўным забясьпячэньні своечасовага выкананьня прамфінпляну.

Пагэтаму з раней існуючых 22 прафсаюзаў будуць створаны 45, з тым, каб за лік ліквідацыі існуючых праміжуткавых зьвяньняў, прыблізіць непасрэднае кіраўніцтва ЦК саюзаў да прадорьемства, да вытворчай нарады, да ўдарнікаў. Гэта дасьць таксама магчымасьць найбольшага ахопу і найлепшага палітычнага і прафэсіянальнага абслугоўваньня новых кадраў рабочых. Адсюль вывад, што ФЗМК павінен зьявіцца **цэнтральнай фігурай** ва ўсёй структуры прафсаюзаў.

Вытворчыя нарады, якія да гэтага часу яшчэ поўнасьцю не перабудаваліся, павінны перабудаваць сваю працу ня толькі па групах, зменах і вучастках, але ж яны павінны будавацца яшчэ і па прафэсіях, што дасьць максімальны эфэкт у праваўоўцы ўсіх вытворчых пытаньняў і найхутчэйшым чынам зьнішчыць маючыяся вытворчыя недахопы. Гэта таксама забясьпечыць больш хуткую рэалізацыю рабочых прапаноў.

Ад прафсаюзаў патрабуецца самае чоткае—канкрэтнае кіраўніцтва сацыяборніцтвам і ўдарніцтвам у паасобных групах, агрэгатах і вучастках. Уся работа павінна быць пастаўлена так, каб шляхам сацыялістычнага вучоту эфэктыўнасьці ўдарніка і ўдарных брыгад магчыма было-б у цэху адрозьніць ударніка ад неўдарніка.

Стварэньне пры міжсаюзных і саюзных органах вытворчых сэкцый і «адрасьлёвых груп" зараз набывае актуальнае значэньне, як у сэнсе зьмяненьня структуры прафсаюзаў, так і ў галіне ўцягненьня ў работу ўдарнікаў, дабрахвотнікаў-актывістых і палепшаньня якаснай іх падрыхтоўкі.

Цэнтр цяжкасьці культработы пераносіцца на культсаветы, якія павінны выключна падпарадкаваць сваю работу задачам выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Рэканструкцыя народнай гаспадаркі пры дыктатуры пралетарыяту забясьпечвае каранное палепшаньне матар'яльнага становішча і быту рабочых. Пагэтаму ўся работа ў прафсаюзах у галіне сацбытавога абслугоўваньня рабочых мас павінна ажыцьцяўляцца праз вытворчую работу, сацыяборніцтва, ударніцтва і іншыя формы і мэтады камуністычнае працы.

У пленум УсеЦСПС са ўсёй рашучасьцю паставіў задачу перад прафсаюзамі аб увядзенні прынцыпу дыфэрэнцыяцыі, як у справе сацстраху, так і ў рабочым забясьпячэньні. Гэта значыць, што ва ўсёй праводзімай рабоце па сац. бытавому абслугоўваньню рабочых павінна быць узята **стаўка на ўдарніка.**

Адначасова з гэтым, прафсаюзы павінны рашуча ўзяцца за выкананьне рашэньняў сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), аб арганізацыі масавага кантролю рабочых, прыцягненьні іх да практычнага ўдзелу і дапамогі ў рабоце рабочай кавпэрацыі.

Перад прафсаюзамі стаіць беспрыкладная задача, зараз-жа разгарнуць практычную працу па ажыцьцяўленьню рашэньняў V пленуму, даводзячы іх да кожнага ўдарніка і рабочага. Далейшая перабудова работы павінна прайсьці па ўдарнаму, бальшавіцкімі тэмпамі, без усялякага паслабленьня ў выкананьні мітодзённых палітыка - гаспадарчых задач, пастаўленых партыяй на сёньняшні дзень. Трэба рашуча ўдарыць па праваапартуністычных і „лявацкіх" настроях, выражаючыхся ў думцы, што новыя мерапрыемствы, намечаныя V пленумам УсеЦСПС, зьяўляюцца зваротам да цэхаўшчыны. Гэтыя настроі, выцякаючыя з няверыя ў сілы і актыўнасьць рабочае клясы, могуць толькі служыць зрыву мерапрыемстваў, намечаных для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады бальшавіцкімі тэмпамі.

Прафсаюзы павінны адказаць усялякім апартуністым, нывікам і маневрам яшчэ большым згуртаваньнем рабочае масы і накіраваньнем іх актыўнасьці на няўхільнае правядзеньне генэральнае лініі партыі. Прафсаюзы павінны зараз-жа ўзяцца за праверку выкананьня дырэктыў, дабіўшыся поўнага і своечасовага іх пераламленьня ў жыцьцё. Партарганізацыям яшчэ больш трэба ўмацаваць штодзённае кіраўніцтва прафсаюзамі, гэта, забясьпечыць сапраўдны і поўны паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці.

Р. І В.

Фабком бязьдзейнічае

Фабком **лямецкай фабрыкі** бязьдзейнічае. Старшыня фабкому ня прымае ніякіх мер к таму, каб наладзіць работу. Прагулы, якія ў апошні час займаюць вялікае месца на фабрыцы, праходзяць міма ўвагі фабкому. Пытаньні выкананьня прамфінпляну па ўсіх яго паказчыках зусім ня цікавяць фабком. Яго таксама ня цікавіць як асобныя групы рабочых і кожны рабочы ў паасобку выконваюць праграмныя заданьні.

Антырэлігійная работа на фабрыцы ніякай не праводзіцца. Бюро ячэйкі «Бязбожнік» існуе на паперы.

На ўсе заўвагі старшыні фабкому аб тым, што неабходна зьвярнуць увагу на наладжваньне работы, ён адмахваецца адказам: «добра, зробім», а пакуль нічога ня робіцца.

Муха.

Культмасавай работы няма

При ВКО няма памяшканьня для разгортваньня культмасавай работы. Нават лікпункту прыходзіцца юціцца па кутох і часта з-за адсутнасьці памяшканьня заняткі зрываюцца. Культмасавы сэктар гэтым пытаньнем зусім ня цікавіцца і ніякіх мер ня прымае, каб стварыць умовы для работы. Адміністрацыя таксама ніякіх мер ня прымае, каб прадаставіць памяшканьне для разгортваньня культмасавай работы.

С. Э.

Фабком і клюб заснулі

Работа фабкому фабрыкі «Прафінтэрн» № 1 не адчуваецца. Сэктары не разгарнулі сваёй дзейнасьці.

Ня гледзячы на энтузіязм рабочых, імкненьне значнай часткі іх ліквідаваць прарывы,—тэхнічны пэрсанал фабрыкі нічога ня ўжыў, каб забясьпечыць нармальную работу цэхаў. У цэхах стварыліся груды запасаў. Пытаньне аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў на фабрыцы не знайшло адпаведнага пераламленьня. У цэхах на падлозе валяюцца кішэні, холст і г. д. Загадчыкі цэхаў на гэта ўвагі не зварочваюць.

За апошні час назіраюцца выпадкі крадзежу чаўнакоў. Грамадзкія арганізацыі, а разам з імі і клюб, амаль ніякай работы па барацьбе за выкананьне прамфінпляну не праводзяць. Фабком таксама стаіць а боку.

Неабходна ўжыць тэрміновыя меры, каб ажывіць работу на фабрыцы.

Раборы.

Сацыяльна-бытавы сэктар працуе дрэнна

У прадпрыемствах сувязі вялікае месца займае звыштэрміновая праца. Асабліва гэта мае месца ў працаўнікоў аўтатранспарту і канторы. Маецца вялікая запазычанасьць за дні адпачынку. Спэцвопратка не выдаецца. Наогул пытаньне аб ахове працы забыта ва ўстановах сувязі. Сацыяльна бытавы сэктар рабачкому працуе дрэнна. Яшчэ горш працуюць гэтыя сэктары ў цэхавых камітэтах. Рабачком павінен зацікавіцца гэтым пытаньнем, прыцягнуць да адказнасьці к раўнікоў, якія дапускаюць без дазволу незаконную звыштэрмінову працу.

Неабходна прыняць меры, каб пункты калдагавору аб выдачы спэцвопраткі былі выкананы.

Кавалерысты.

Бюракратызм, мяжуючы са шкодніцтвам

Многа маецца бюракратызму на якулярнай фабрыцы, многа коснасьці і нічоганядзеланьня.

Адзін з найбольш закаранелых бюракратаў ня член саюзу, быўшы за безгаспадарчасьць пад судом гр. Анціховіч, рашыў на запытаньне важнейшых фабрык і заводаў аб лёсе іх заявак на паперадждальныя прыборы, даваць афіцыйныя спраўкі, што ў справах якулярнай фабрыкі няма гэтых заявак, што аказалася хлусьнёй. Калі Анціховіч быў злоўлены на месцы злачынства, пры дачы трэцяй няправільнай даведкі і справа аб ім паступіла ў фабком і парткалегіўм, дык замест рэагаваньня на гэтае, зьбіраюцца даць яму яшчэ павышэньне.

Ю. Ст.

Кожны камсамолец і малады рабочы

павінен ведаць, што парашылі IX усесаюзны і X усебеларускі зьезды ленінскага камсамолу

Аб распрацоўцы пастаноў IX усесаюзнага і X усебеларускага зьездаў ЛКСМ

Пастанова бюро гаркому ЛКСМБ

Распрацоўка пастаноў зьездаў павінна прайсьці пад знакам вывучэньня ўсёй камсамольскай арганізацыяй і беспартыйнай рабочай моладзю пастаноў зьезду і пераламленьня гэтых пастаноў у практычнай рабоце камсамольскіх ячэек.

Галоўная ўвага пры распрацоўцы павінна быць накіравана на вывучэньне камсамольцамі чарговых задач партыі і камсамолу, мабілізацыя на барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі і на перабудову ўсёй камсамольскай работы ў адпаведнасьці з пастаўленымі зьездамі КСМ і сьнежаньскім пленумам ЦК УсеКП(б) задачамі.

Распрацоўку пастаноў зьездаў устанавіць наступным парадкам: склікаць агульна-гарадзкі сход камсамольскага актыву з парадкам дня:

1) Вынікі ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў.

2) Аб узяцьці шэфства над Чырвоным флётам.

Распрацоўку правесьці з 11 лютага па 11 сакавіка, праводзячы заняткі раз у пяцідзёнку, устанавіўшы адзіныя дні 11, 16, 21, 26 лютага, 1, 6 і 11 сакавіка. Распрацоўку праводзіць на агульных адчыненых сходах з прыцягненьнем беспартыйнай моладзі і старэйшых піанэраў (пры наяўнасьці дастатковай колькасьці ў ячэйцы дакладчыкаў, лічыць мэтазгодным разьбіўку ячэек пры распрацоўцы на гурткі). Распрацоўку пастаноў зьезду скарыстаць для павышэньня шэрагаў КСМ за кошт рабочай моладзі.

Прапанаваць ячэйкам КСМ навучальных устаноў вабясьпечыць садружаственыя вытворчыя ячэйкі КСМ дакладчыкамі па пытаньнях зьезду, усклаўшы адказнасьць на бюро гэтых ячэек, разам з ячэйкамі прадпрыемстваў, за вынікі распрацоўкі. Акрамя гэтага, прапанаваць ячэйкам навучальных устаноў вылучыць у распараджэньне Гаркому наступную колькасьць дакладчыкаў: педагагічны інстытут—5 асоб, каапэрацыйны тэхнікум—5 асоб, яўпэдтэхнікум—6 асоб, вэтінстытут—5 асоб, палітэхнікум—5 асоб, рабфак пэдінстытуту—5 асоб, рабфак вэтінстытуту 5 асоб, мастацкі тэхнікум—3 асоб, працасьветы—8 асоб, БПТ—3 асоб.

Лічыць неабходным праводзіць распрацоўку мэтадам сацспаборніцтва, арганізаваўшы пасьля распрацоўкі палітбой па пытаньнях зьезду (паміж асобнымі ячэйкамі).

Даручыць аддзелу тэорыі і прапаганды забясьпечыць літаратурай па пытаньнях зьезду як ячэйкі, так і АПА-габінэт і арганізаваць групавы інструктаж дакладчыкаў па пытаньнях зьезду.

Лічыць неабходным арганізацыю 3—4 дзённых курсаў камсамольскага ячэйковага актыву па пытаньнях асобных галін камсамольскай работы ў сувязі з зьездам. Падрыхтоўку і плян работы курсаў даручыць выпрацаваць у аднадзённы тэрмін т. Шапіра.

У мэтах больш плянавага ходу распрацоўкі і лепшага мэтадычнага абслугоўваньня дакладчыкаў, устанавіць наступны адзіны парадак распрацоўкі:

1) Даклад ЦК УсеЛКСМ.
2) Аб нацыянальна-культурным будаўніцтве. Зьвязаць з дакладам ЦК ЛКСМБ на X зьезьдзе ЛКСМБ.
3) Аб рабоце КІМ'у.
4) Аб рабоце на вёсцы.
5) Аб рабоце сярод дзяцей.

Усе даклады ўсесаюзнага зьезду павінны быць увязаны з адпаведнымі дакладамі ўсебеларускага зьезду.

Пасьля распрацоўкі неабходна правесьці палітбой па матар'ялах зьезду і вынікі ўсёй распрацоўкі не пазьней 16-га сакавіка даслаць у ГК КСМ.

Зараз-жа пачаць прапрацоўку

Сёньня друкуецца пастанова Гаркому ЛКСМБ аб распрацоўцы рашэньняў IX Усесаюзнага і X Усебеларускага зьездаў камсамолу. Кожная ячэйка, кожны камсамолец павінны ўважліва падыйсьці да гэтае пастановы, павінны прыняць усе залежачыя ад іх меры для максімальна-лепшага вывучэньня арганізацыяй пастаноў зьезду.

Пастановы гэтых зьездаў, выходзячы з дырэктыў партыі, па сутнасьці, зьяўляюцца праграмай работы камсамолу ў перыяд сканчэньня пабудовы фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Распрацоўваючы пастановы зьездаў, мы павінны пераламіць іх у практычнай рабоце кожнай ячэйкі, выходзячы з яе ўмоў і асаблівасьцяй.

Практычным вынікам распрацоўкі павінна зьявіцца перабудова шэрагу галін камсамольскай работы ў адпаведнасьці з пастановамі зьезду, у адпаведнасьці з тэмпамі будаўніцтва сацыялізму.

Распрацоўка пастаноў зьезду павінна паказаць беспартыйнай рабочай моладзі задачы камсамолу, як аднаго з мацнейшых памоцнікаў партыі ў барацьбе за будаўніцтва сацыялізму, за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю. Адсюль вынік — больш ахоп распрацоўкай беспартыйнай рабочай моладзі і ўцягненьне яе ў выніку распрацоўкі ў шэрагі камсамолу.

Распрацоўка пастаноў зьезду пакажа ўсім камсамольцам, што толькі ў бязьлітаснай барацьбе, якую вёў і будзе весьці камсамол з права-«лявацкімі» ўхілістымі і прымірэнцамі да іх у партыі і камсамоле, магчыма пасьпяховае будаўніцтва сацыялізму.

З разгорнутай самакрытыкай мы павінны падыйсьці да абгаварэньня работы кожнай ячэйкі ў час распрацоўкі рашэньняў зьезду—гэта, самакрытыка дапаможа нам лепш пабудаваць сваю работу згодна пастаноў зьезду.

Кожны камсамолец, кожны малады рабочы павінен ведаць пастановы зьезду, работу і задачы трохмільённай камсамоліі пад кіраўніцтвам партыі Леніна, будуючай сацыялізм.

А. Ш.

Аб агляде становішча школ ФЗВ і аб скліканьні агульна-гарадзкой канфэрэнцыі вучняў ФЗВ

(Пастанова бюро гаркому КП(б)Б)

1. Мерапрыемствы бюро Гаркому КСМ па правядзеньню агляду школ ФЗВ і аб скліканьні агульна-гарадзкой канфэрэнцыі вучняў ФЗВ зацьвердзіць.

2. Прапанаваць Гарсавету, Гарпрафсавету і інспэкцыі працы зараз-жа ўключыцца ў правядзеньні гэтай справы, забясьпечыўшы актыўны ўдзел як у агляде, так і ў правядзеньні канфэрэнцыі.

3. Прапанаваць гаспадарнікам і парткалектывам, там, дзе маюцца школы ФЗВ, актыўна ўдзельнічаць у праводзімым агляде і ў скліканьні канфэрэнцыі, абавязаўшы апошніх прысутнічаць на канфэрэнцыі.

4. Рэдакцыі газэты «Віц. Пралетары» асьвятляць ход агляду і становішча школ ФЗВ.

5. Пра сканчэньні агляду на бюро ГК партыі заслухаць вынікі агляду і становішча працы ФЗВ.

Больш чотка арыентаваць арганізацыю па пытаньнях росту

У газэце «Віцебскі Пралетары» у № 31 ад 8 га лютага зьмешчан артыкул тав. С. Ф. „Рашэньні 9 га зьезду УсеЛКСМ—у масы", у якім тав. С. Ф. у 2 х мясцох праводзіць думку, што «камсамол павінен узрасьці за кошт лепшых маладых рабочых-ударнікаў».

Ставячы пытаньне аб прыёме толькі лепшых ударнікаў, тав. С. Ф. гэтым самым па сутнасьці зьнімае лёзунг 100 проц. уцягненьня рабочай моладзі ў КСМ. Паколькі артыкул названы «Рашэньні зьезду УсеЛКСМ у масы», у чытачоў газэты можа стварыцца ўражаньне, што гэта ёсьць установка 9-га зьезду.

Бязумоўна, гэты погляд зьяўляецца палітычна-памылковым, не правільна арыентуе арганізацыю ў пытаньні росту і супярэчыць пастановам зьезду, вывучаць якія правільна заклікае тав. С. Ф.

Пачынаючы з 7-га Усесаюзнага зьезду КСМ, лёзунг 100 проц. ахопу рабочай моладзі ў КСМ быў і застаўся адной з важнейшых задач камсамолу.

Бязумоўна, лепшыя ўдарнікі павінны быць у шэрагах КСМ, але ў КСМ павінны ўступіць і ўсе маладыя рабочыя ўдарнікі і ўсе маладыя рабочыя, якія, уступіўшы ў КСМ, пад уплывам арганізацыі хутка зробяцца лепшымі ўдарнікамі.

З камсамольскім прывітаньнем

бюро гаркому ЛКСМБ.

Ад рэдакцыі. Зьмяшчаючы ліст бюро гаркому ЛКСМБ, рэдакцыя лічыць, што артыкул т. С. Ф аб выніках 9 га Усесаюзнага зьезду КСМ у асноўным правільна арыентуе віцебскую камсамольскую арганізацыю ў задачах, выходзячых з дадзеных зьездам рашэньняў. Заўвага бюро гаркому КСМ наконт няправільнай фармуліроўкі па пытаньню аб росьце, маючайся ў арт. С. Ф., зусім верна, але здарылася гэта таму, што пры вёрстцы газэты выпаў адпаведны абзац, што, зразумела, ня зьнімае адказнасьці з рэдакцыі за гэтую памылку, якой дадзена належная адпор ка ў лісьце бюро гаркому ЛКСМБ.

Агульна-гарадзкі сход камсамольскага актыву

12 га лютага, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу гаркому КП(б)Б адбудзецца

гарадзкі сход камсамольскага актыву.

Парадак дня: становішча віцебскай камсамольскай арганізацыі (вынікі абсьледваньня—дакладчык сэкратар ЦК ЛКСМБ т. **Паляноў**).

Ячэйкі павінны атрымаць у гаркоме пропускі.

ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЧЫГУНКІ

станьце на чале ўзрастаючага руху за рэканструкцыю транспарту

КАМУНІСТЫ, КАМСАМОЛЬЦЫ І ПЕРАДАВЫЯ БЕСПАРТЫЙНЫЯ РАБОЧЫЯ ПАВІННЫ ПАВЕСЬЦІ ЗА САБОЙ УСЮ МАСУ РАБОЧЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ТРАНСПАРТНАЙ ПЯЦІГОДКІ Ў 3 ГАДЫ

Рашуча выкарчаваць недахопы

Віцебскі вузел, адзін з асноўных зьвеньняў 6-га эксплёатацыйнага раёну МБВ чыг., мае ў выкананьні сваіх вымернікаў буйнейшыя прарывы. Гэта даволі выразна паказала нарада начальнікаў станцый і старшынь мясцкомаў раёну.

Сярэдні процант выкананьня галоўнейшых вымернікаў, сьледваньне цягнікоў па расьпісаньню —47,7 проц, камэрцыйная хуткасьць—77,3 проц. заданьня, па звароту вагонаў—68,6%, сярэдне-сутачны прабег вагонаў—87,2 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што як і ўвесь транспарт, так асабліва транспарт 6 га раёну неабходна пабальшавіцку падцягнуць да ўзроўню патрабаваньняў бурнага росту сацыялістычнай гаспадаркі нашай краіны. Трэба неадкладна дабіцца рашучага пералому ў рабоце ўсяго раёну і асабліва віцебскага вузла.

Пад гэтым кутом погляду, па ініцыятыве станцыйнага камітэту КП(б)Б і Учкпрафсожу была праведзена 7-га лютага нарада старых кадравых рабочых вузла, лепшых перадавікоў вытворчасьці, актыўна ўдзельнічаючых у грамадзкай рабоце.

Больш усяго выступаўшыя спыняліся на апошнім звароце СНК СССР і ЦК УсеКП(б), называючы яго баявым загадам партыі і ўраду.

Вось аб чым гаварылі перадавікі-чыгуначнікі.

Каралькоў С. М.

Трэба неадкладна спыніць тыя шматлікія непаладкі, якія перашкаджаюць баявой рабоце вузла. У нас няма належнай працоўнай дысцыпліны, мы праводзілі суботнік па ўборцы сьнегу, але з-за загружанасьці парку, гэты суботнік амаль праваліўся. 3-га лютага адпраўляюць у Чэпіка цягнік, а ў ім буксы былі не ў парадку. Магло здарыцца крушэньне. Туды-ж адпраўляюць замест двух чалавек для рамонту, брыгаду з 14 чалавек.

Тав. Пястуновіч

Зварот СНК і ЦК ёсьць удар па агэнтуры Рамзіна на транспарце. Што трэба зрабіць чыгуначнікам для рэалізацыі гэтага звароту? Ужыць самыя жорсткія меры супроць прагульшчыкаў, п'яніц, як зрыўшчыкаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Больш увагі рацыяналізацыі. Зварот узьняў хвалю ініцыятывы рабочых, а адміністрацыя раёну ня прыслухоўваецца к іх прапановам.

Тав. Валасач (дэпо)

Многія з рабочай моладзі з недастатковай сурёзнасьцю адносяцца да распараджэньняў цэхавай адміністрацыі, а адсюль дрэнная якасьць работы. Камсамолу неабходна прыглядзецца да паводзін на вытворчасьці некаторай часткі моладзі. Ганьба тым, хто лічыць сябе ўдарнікам, а на споўве тармозіць своечасова рамонт паравоза.

Тав. Гулецкі (машыніст-прыёмшчык)

Распрацоўка адозвы ідзе надта марудна. Але ўсё-ж яна выклікала цэлы шэраг прапаноў з боку рабочых. Асноўнае ў гэтых прапановах: «дайце паравозу гаспадара, каб ён адказваў ляпей за сваю работу, за эканомію апалу, за ліквідацыю спазьненьняў цягнікоў».

Северын (аглядчык вагонаў)

Адміністрацыя не падтрымоўвае прапановы ўдарнікаў па частцы рацыяналізацыі самой работы па агляду. У выніку мы маем частыя здараньні. Дрэнна з забесьпячэньнем матэрыялам для рамонту вагонаў. Колькі разоў гаварылася на нарадах аб неабходнасьці агляду вагонаў у нярухомым становішчы, але гэта ня робіцца. Нашы прапановы проста зьнікаюць.

Пржэвальскі (дэпо)

Рабочая маса з энтузіязмам сустрэла зварот ЦК партыі і ўраду. На ўсіх сходах, партыйных і беспартыйных, рабочыя кляймілі ганьбой прагульшчыкаў, лодыраў, але ў той жа час прасілі, каб і адміністрацыя падцягнулася.

Адміністрацыя дагэтуль ня выпрацавала нормы хуткасьці паравоза і ў той-жа час накладае спагнаньні за спазьненьні на машыніста, а аб сваёй віне забывае. Дагэтуль некуды паставіць пасажырскія паравозы, якія стаяць на марозе і псуюцца, у той час, як можна скарыстаць старое дэпо.

Сердзюк (галоўны кандуктар)

Недысцыплінаванасьць многіх рабочых, пераходзячую часам у шкодніцтва, можна ахарактызаваць наступнымі фактамі. Праўда, у гэтых фактах вінаваты ня толькі паасобныя рабочыя, але галоўным чынам адміністрацыя ў прыватнасьці дыспэтчары. Напрыклад, 2 га лютага яны накіравалі рэзэрвную брыгаду ў Дно і ў гэты ж час з Дно адправілася ў Віцебск такая-ж брыгада. 4 га лютага зноў адпраўляецца ў Дно брыгада, у той час, калі там на месцы маюцца тры рэзэрвных брыгады. Гэта самае выразнае шкодніцтва ў рабоце. Мы мелі за сьнежань у выніку такой работы 841 гадз. дрэнна патрачанага часу. Наглядзі з вагонамі дрэнны, 6 га лютага мы адправілі адзін паравоз з папсаванымі буксамі, што магло прывесьці да крушэньня. З п'янкай, прагуламі трэба рашуча змагацца. Для гэтага трэба, каб партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі ўзмацнілі сваю пільнасьць на гэтым вучастку.

Батаноў (машыніст)

Партыйная і прафэсыянальная арганізацыі вузла мала зрабілі ў адносінах звароту чыгуначнікаў на транспарт. Наш вугальны склад зроблены шкодніцкімі рукамі, бо ён ня можа на сёньняшні дзень своечасова загрузіць паравоз апалам. Намесьнік загадчыка дэпо Анісімаў абсалютна ня лічыцца з заўвагамі рабочых наконт правядзеньня адпаведных рацыяналізатарскіх мер, асабліва на складзе. З-за павярхоўнай работы 3-га лютага спалілі лішніх 5 тон вугаля, мед 10 гадзін прастою з паравозам, які ў гэты дзень адправіўся на Невель. Мы маем такія факты, калі цягнік выпускаецца адразу-ж пасьля павярхоўнага агляду, а потым прыходзіцца зноў яго рамантаваць. Гэта я лічу простым шкодніцтвам, якому трэба рашуча палажыць канец.

У спрэчках па інфармацыі, зробленай т. Хролам аб задачах нарады лепшых перадавікоў вузла, выказаліся з запісаўшыхся 23 чалавек — 16. Выступаючыя тт. **Магільніцкі, Зарэмба, Воўкаў, Брэнч** і інш. прывялі яшчэ шмат фактаў нераспараджальнасьці адміністрацыі і нават прасьледваньня ўдарнікаў, якія паказваюць на паасобныя недахопы ў рабоце (факт з вымовамі 4 м лепшым ударнікам таварнага двара і інш.). Ва ўсіх выступленьнях адбівалася асноўнае—якім чынам па-бальшавіцку рэалізаваць зварот ЦК і СНК, каб хутчэй абярнуць бы-ра ён у магутную гаспадарчую адзінку пасьпяхова выконваючую тыя заданьні, якія ўскладзены на нас трэцім рашаючым годам пяцігодкі. Гэтай думкай былі прасякнуты ўсе выступленьні старых кадравікоў вузла, якія абяцалі актыўна змагацца з усімі могучымі яшчэ спаткацца перашкодамі ў рабоце.

— На рашучае змаганьне з недысцыплінаванасьцю, з п'янкай, прагуламі, з шкодніцтвам, з бюракратычным глушэньнем творчай ініцыятывы рабочых, з зажымам крытыкі і самакрытыкі,—вось асноўнае, аб чым гаварыла лепшая частка рабочых віцебскага вузла.

Такія нарады трэба часьцей склікаць...

Па-баявому выканаць практычныя мерапрыемствы

Станцыённы партыйны камітэт і цэх'ячэйкі, пачынаючы з 14-га студзеня, заняты прапрацоўкай звароту ЦК і СНК аб транспарце. Праведзена нарада партактыву, адбыліся куставыя сходы цэх'ячэек, зварот абгаварваецца на рабочых сходах.

Выступаўшыя на нарадзе партактыву (прысутнічала з 106 94 чал.) абяцалі прыняць усе неабходныя меры, каб уцягнуць 100 проц. рабочых у праводзімую рэарганізацыю. Адзначана, што гэтая справа пакуль што ідзе самацёкам. Прафэсыянальныя арганізацыі, рабочыя-ўдарнікі як сьлед у рэарганізацыі ня ўдзельнічаюць. Зазначалі неабходнасьць узьняцьця адказнасьці як адміністратараў, так і рабочых за выконваемую работу, за лепшае скарыстоўваньне рабочай сілы, за рацыянальную расстаноўку яе.

Гаварылі аб неабходнасьці перабудовы работы ўсіх партыйных і прафсаюзных арганізацый вузла тварам да вытворчасьці. Цэх павінен стаць баявой адзінкай, якая дапаможа выкананьню баявога загаду партыі і ўраду.

Партыйны сход вузла, разам з камсамольцамі, абгаварыўшы даклад аб рэарганізацыі транспарту, прыняў у аснову рэзалюцыю партактыву па гэтаму пытаньню і ў сваю чаргу абяцаў па-баявому ажыцьцявіць практычныя мерапрыемствы, намечаныя паткамітэтам і краўніцтвам раёну, па рэарганізацыі транспарту. Сход асаблівую ўвагу зьвярнуў на неабходнасьць хутчэйшага ўнядрэньня адзіначальля, правядзеньня пабаявому рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і лепшага скарыстаньня рабочых прапаноў. Адзначана важнасьць праводзімай зараз рэарганізацыі каапэрацыі.

Сход спыніўся на кіруючай ролі камуністых на вытворчасьці, паказаўшы на неабходнасьць рашучай барацьбы з апартунізмам.

Бальшавіцкая ударнасьць яшчэ не прасякнула ўсіх удзельнікаў калгаснай вясны

Напрудзіць сілы на выкананьне баявой праграмы севу

Задачы прыгарадных гаспадарак ЦРК у другой бальшавіцкай вясьне і дапамога пролетарскага гораду

Вялічэзны рост сацыялістычнай прамысловасьці, у зьвязку з гэтым рост рабочае клясы і яе культурна-бытавых запатрабаваньняў, высоўваюць перад спажывецкай каапэрацыяй рад складаненьных праблем і задач у галіне рабочага забясьпечаньня. Аб гэтым з асаблівай яскравасьцю сказалі сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) і студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б.

Прыгарадныя гаспадаркі ў рабочым забесьпячэньні адыгрываюць адну з галоўных і асноўных роляй. Вось чаму зараз павінна быць зьвернута ўвага ўсёй рабочай клясы і працоўнай грамадзкасьці на пасьпяховае правядзеньне вясновай сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

У прыгарадных гаспадарках Віцебскага ЦРК павінна быць: **засеяна 900 га гародаў, пастаўлена на адкорм 1900 галоў малочнай жывёлы, арганізавана сьвінаматачная гаспадарка на 1000 галоў і апроч таго, адкормлена 9 тысяч сьвіней, арганізавана птушкаводная гаспадарка на 5 тысяч шт. птушак і адкормлена 2 тысячы кролікаў.**

Усяго масцца ў нас 7 гаспадарак, якія займаюць плошчу ў 3444 га. Уся зямля не ўпарадкована, а на трох гаспадарках—«Тулава», «Новы Шлях» і „Парыская камуна» зусім невядомы нават межы гэтых гаспадарак. На ўсёй гэтай зямлі ЦРК па складзеных плянах мяркуе засеяць 900 га гародаў, разьвясьціць 1200 кароў, 5 тысяч птушак і 9 тысяч шт. сьвіней. Няма зусім зямлі для арганізацыі сьвінаматачных гаспадарак і для закладкі 155 га ягадзікаў і пастаноўкі 650 кароў.

Згодна складзенага пляну прыгарадныя гаспадарні ў гэтым годзе павінны даць: гародніны 13568 тон, што складае ня 77 проц. усёй патрэбы, малака 1 мл. 476 тысяч літраў, што складае 34,3 проц. патрэбы, мяса 470 тыс. тон, што складае 24,4 проц., сала 302,4 тыс. тон, —68 проц. патрэбы.

З гэтых лічбаў відаць, якія вялізарныя задачы стаяць перад прыгарадныя гаспадаркамі ў гэтым годзе ў галіне забясьпечаньня рабочых гародніной, мясам, малаком і інш. прадуктамі і зусім зразумела, што выкананьне іх патрабуе ад рабочых фабрык і заводаў, партыйнай і савецкай грамадзкасьці актыўнай дапамогі. Неабходна тэрмінова мабілізаваць увагу грамадзкасьці вакол бальшавіцкага севу ў прыгарадных гаспадарках. Забясьпечаньне гораду залежыць ад нас саміх. Трэба прыцягнуць усе нашы магчымасьці да ажыцьцяўленьня гэтых плянаў.

Для правядзеньня севу ў прыгарадных гаспадарках патрэбна 1650 чал. Маецца ўсяго 450, г. зн. 27%. Патрабуецца тэрміновая і неадкладная праца па вырбоўцы рабсілы з аднаго боку і прымацаваньне асобных гародаў да буйных прадпрыемстваў - з другога.

Нівод ін воз гною не павінен застацца ў горадзе. **100 проц. гною гораду на палі гародаў прыгарадных гаспадарак. Гэтае павінна быць лёзунгам сёньняшняга дню.** Усяго для палёў гаспадарак патрабуецца 58 тысяч вазоў гною.

Акрамя гэтага, неабходна даць прыгарадным гаспадаркам 36 тысяч пудоў мінэральных угнаеньняў. Для выкананьня ўсёй гэтай працы неабходна 520 коняй, а маецца ў гаспадарках толькі 200. Такім чынам патрабуецца дапамога тых арганізацый, якія маюць сваіх коняй. Вялікую дапамогу можа аказаць у гэтых адносінах кам рэст.

Ня менш востра стаіць пытаньне з будаўніцтвам у гаспадарках. Ад сутнасьць жыльлёвых памяшканьняў не дае магчымасьці вытвараць на бор рабочае сілы. Патрабуецца тэрміновая мабілізацыя ня менш 150 ч. будаўнікоў з гораду і перакідка іх на будаўніцтва.

Задачы даволі вялікія і патрабуюць напружанасьці сіл і энэргіі, мабілізацыі ўсіх нашых магчымасьцей, каб плны вясновай сяўбы ў прыгарадных гаспадарках былі перавыкананы.

Аграном Мірміна.

Гнаць Пятровіча з завода

Пасылаючы рабочыя брыгады на вёску ў дапамогу вясковай сяўбе, неабходна, каб гэтыя брыгады запаўняліся лепшымі рабочымі ўдарнікамі, вытрыманымі таварышамі, тымі, хто сапраўды будзе дапамагаць у правядзеньні бальшавіцкага севу. Намячаючы кандыдатуры, неабходна кожнага дэталёва абгаварыць.

Ня зусім так зрабіў **завод «Чырвоны Мэталіст».**

У вылучаную брыгаду з 20 чал. папаў рабочы плужнага цэху **Пятровіч Аляксандар,** які ні ў якім разе ня можа быць пасланы на такі адказны вучастак працы. Яго ўчынкі гавораць аб тым, што ён не павінен быць у рабочым асяродку. Пятровіча неаднаразова разаблачалі ў падпольцы нарадовых лістоў за звыштэрміновыя работы, Пятровіча разаблачылі ў арганізацыі асобных груп рабочых для таго, каб заняць месца прыёмшчыка. Пятровіча рабочыя ведаюць, як варожы элемэнт—антысэміта, які спачувае пагромшчыкам, аб чым газэта «Матпромавец» у свой час пісала. Пятровіч вядомы сваімі парушэньнямі вытворчай дысцыпліны і захоўваньнем інтэнсыўнасьці працы, аб чым справа разглядалася ў грамадзкім трыбунале. Пятровіч цкаваў старога рабочага і члена партыі т. Фрумкіна, пасля ён віне выпускаюцца нагодныя саламарэзкі. Здавалася б, што гэтая «дзейнасьць» Пятровіча ні ў якім разе не дазваляе яму быць пасланым на правядзеньне палітычнай кампаніі.

Баганаў.

У камтрэсьце ёсьць „свае" кампаніі

Праверка падрыхтоўкі віцебскага камтрэсту да другой бальшавіцкай вясны выявіла, што гэтая арганізацыя не ўявіла задач бальшавіцкага севу і парашыла, што „іх хата з краю". Пытаньне аб севе на рабочых сходах не абгаварвалася. Групком самастойна вылучыў брыгаду з 6 асоб для паездкі на вёсцу, бяз удзелу рабочай масы. Групком тлумачыць гэта „простай" прычынай. Ім нельга склікаць сходаў рабочых—няма „фізычнай" магчымасьці. У групкоме разважаюць, што ў іх і бяз гэтай вясны хопіць сваіх каміаній.

Пры віцкамтрэсьце маюцца: лазьні, электрастанцыя, вадакачкі і іншыя прадпрыемствы, дзе магчыма было-б зьбіраць попел, але камтрэст лічыць, што гэта не яго справа.

Усе гэтыя агіднейшыя факты сьведчаць аб тым, што ў камтрэсьце недаацанілі важнасьці другога бальшавіцкага севу, не праводзяць у жыцьцё пастановы апошніх пленумаў ЦК партыі.

Сурганаў.

Задачы бальшавіцкага севу давесьці да кожнага рабочага

Панчошная фабрыка «Клары Цэткін» шэфствуе над Вярхоўскім сельсаветам, Бешанкавіцкага раёну. Фабрыка паслала свайму падшэфнаму сельсавету трыер для ачысткі насеньня і трактар.

3-га лютага распрацавана было пытаньне на бюро парткалектыву аб пасылцы на вёску ў дапамогу правядзеньню вясновай сяўбы рабочыя брыгады. Вылучана 10 лепшых рабочых для паездкі на вёску.

Пытаньне аб правядзеньні другога бальшавіцкага севу на рабочых сходах не прапрацавана. Асноўная маса рабочых ня ведае аб задачах другой калгаснай вясны. Гэты недахоп тэрмінова павінен быць выпраўлены.

С.

Узялі баявыя абавязкі

На-днях адбыўся зьлёт рабкораў віцебскага вузла, які абгаварыў становішча друку на вузьле і задачы ўсесаюзнай нарады па рабселькораўскаму руху; сход прайшоў пад знакам рашучай крытыкі недахопаў, якія перашкаджаюць выкананьню вымернікаў.

У спрэчках гаварылі, што ні адміністрацыя, ні саюз на заметкі не рэагуюць. Адзначана, што і рабкоры яшчэ па сапраўднаму з парушэньнямі дысцыпліны, расхлябанасьцю, шкодніцтвам не змагаюцца. Неабходна скласьці брыгады, якія-б выяжджалі на лінію і дапамагалі мясцовым арганізацыям у выкананьні прамфінпляну. Шмат рабочых лагэтуль ня ведаюць сэнс праводзімай рэарганізацыі

Газэта «Молат» і цэхавы друк слаба змагаліся за беларусізацыю, за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтую работу трэба праводзіць не кампанейскі, а штодзённа

Зусім забыта палітычна выхаваўчая работа з рабкорамі, у насьценгазэтах няма палітыкі і зубастай крытыкі. Газэта ня выкрывала ілжэўдарнікаў. Трэба неадкладна стварыць брыгады для праверкі рэагаваньня на заметкі рабкораў і прапановы рабочых.

Трэба ўзмацніць сувязь рэдкалегіі «Молата» з насьценгазэтамі вузла і рабкорамі, даючы апошнім заданьні.

Каб палепшыць выхаваўчую работу сярод рабкораў, прапанавалі неадкладна арганізаваць сэмінарый, падхопліваць своечасова тыя мерапрыемствы, якія зьяўляюцца важнейшымі на сёньняшні дзень, зьяўляюцца адной з важнейшых задач «Молата».

Барацьба за здаровы паравоз праходзіць міма газэты. Дыспэтчары дрэнна кіруюць работай паравозных брыгад, адсюль частыя здарэньні і нават крушэньні. На гэты фронт газэты павінны пераключыцца.

Казалі, што «Молат» не праводзіць агляд цэхавых газэт, а гэта значна дапамагло-б друку стаць больш зубастым у барацьбе за ажыцьцяўленьне палітычна-гаспадарчых задач. Кіраўніцтва раёну ня толькі не рэагуе на заметкі рабочых, але нават ня лічыць патрэбным удзельнічаць у друку.

На вузьле маюць месца шавінізм і антысэмітызм, на якія некаторыя арганізацыі не рэагуюць.

Чыгуначнаму друку трэба больш асьвятляць пытаньні, зьвязаныя з вёскай. Перабудова вёскі на сацыялістычны лад не павінна праходзіць міма рабочых.

Разгортваньне крытыкі, самакрытыкі і накіраваньне зброі яе супроць апартунізму ўсіх відаў значна дапаможа нам у выкананьні задач трэцяга году пяцігодкі. Рабкораўская армія чыгункі павінна з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю ўдарыць па перашкодах у выкананьні транспартнага пляну. Неабходна змагацца з адхіленьнямі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, накроўваючы руйнуючы агонь супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, контррэвалюцыйнага беларускага нацыяналдэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў.

Зьлёт прыняў рэзалюцыю, у якой вітае ініцыятыву «Правды» па скліканьню ўсесаюзнай нарады па рабселькораўскаму руху і адзначае, што нарада павінна будзе выпрацаваць тыя мерапрыемствы, якія ўзброяць друк, асабліва нізавы, у барацьбе за ажыцьцяўленьне рашэньняў аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Зьлёт падкрэсьлівае недастатковую барацьбу рабкораў, лепшых перадавікоў вытворчасьці за генэральную лінію партыі, барацьбу з апартунізмам усіх відаў і асабліва з правым, як галоўнай небясьпекай.

Зьлёт прыняў на сябе рад баявых абавязкаў: ніводнага рабкора ня-ударніка; ва ўсіх цэхах арганізаваць рабкораўскія пасты для дапамогі адміністрацыі і прафсаюзным арганізацыям у выкананьні намечанага транфінпляну; стварыць ва ўсіх цэхах сквапныя рабкораўскія брыгады.

Вітаючы ініцыятыву рабкораў ленінградзкага камбінату «Красный Треугольник», зьлёт вузла прыняў на сябе абавязак па збору рабочых прапаноў па рацыяналізацыі вынаходзтваў, дапамагаць у правільнай расстаноўцы рабочай сілы і паказаць прыклад у складаньні сустрэчнага транфінпляну.

Зьлёт таксама выказаўся за пераводзіць «Молата» з дзесяцідзёнкі на пяцідзёнку.

Скончыць у тэрмін рэарганізацыю сыстэмы кіраўніцтва

Адбыўшаяся нядаўна нарада начальнікаў станцый і старшынь мясцкомаў 6 га эксплёатацыйнага раёну абгаварыла выкананьне транфінпляну. Спрэчкі ішлі ў напрамку рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб чыгуначным транспарце.

Паказвалася на тое, што райпрафсаж недастаткова змагаецца з парушэньнем працдысцыпліны, адзіначальле на многіх вучастках і асабліва на Віцебскім вузьле як сьлед не адчуваецца. Інжынэрна-тэхнічныя сілы камандырамі вытворчасьці не зьяўляюцца. Дрэнна з выкананьнем рабочых прапаноў, ня толькі адміністрацыя, але нават і мясцком ня ўлічваюць іх. Вытворчыя нарады запаняпалі толькі таму, што няма руху ў рэалізацыі каштоўных прапаноў рабочых.

Нарада ў вынесеных пастановах зазначыла, што 6-ы эксплёатацыйны раён, які зьяўляецца адным з важнейшых пунктаў у сыстэме транспарту, асабліва як раён прымежны, павінен пераключыцца на баявыя тэмпы работы. Выкананьне кантрольных лічбаў за ўдарны квартал паказвае зусім незадавальняючую працу раёну. Нарада абавязвае ўсіх гаспадарнікаў раёну, усе мясцкомы скончыць у тэрмін праводзімую зараз рэарганізацыю сыстэмы кіраўніцтва, уцягваючы ў гэтую справу шырокія масы рабочых.

אויספילן און איבערשטייגן די קאנטראל-ציפערן, רעאליזירן די געזערד-לאטעריי

די ווטעבסקער שטאט-סארוואלטונג פון געזערד איז צוגעטראטן צו פארשפריטן די בילעטן פון דער 3-טער געזערד-לאטעריי אין סומע פון 60 פוינטן.

די געזערד-לאטעריי דארף דורכגעפירט ווערן ווי א ברייטע מאסן-קאמפאניע, אין וועלכע עס זאל אריינגעצויגן ווערן אלע סאוועטישע ארגאניזאציעס. אין דעם אונטערנעמען דורכפירן די געזערד-לאטעריי מוזן אנטייל-נעמען די פראפעסיאנעלע ארגאניזאציעס: די ארסקאמען, זאוואקאמען, פאבריקן, לאאפעראציע, הויכשולן, קוסט-געווערב ארטעלן, זשאטן-סארייניקונג. ס'איז נויטיק, אז דער שכאב-קאמיטעט פון קפ(ב)וי סון קאמיטעט, דער שטאט-פראפראט זאל באזארגן און מיטהעלפן אין דער דורכפירונג פון דער קאמפאניע מיט געהעריקע דיזעקטיוון, בריוו, ארויסרעטונגען. די לערער שאפט דארף פאפוליאריזירן די געזערד-לאטעריי אין די שולן און צוציען די שול-ארגאניזאציעס אין אומטלבארן פארשפרייטן די בילעטן. די לאטעריי-קאמיסיע האט אָנגעמערקט קאנטראל-ציפערן פון פארשפרייטן די בילעטן פאר יעדער אונטערנעמונג, אנשטאלט.

ווען די קאנטראל-ציפערן וועלן ווערן נים נאר איבערגעפילט, נאר איבערגעשטיגט, דאן נאר קען מען זיכערן דעם דערפאלג פון לאטעריי. דער סאצנועטע דארף זיין איינער פון די הויפט-מעטאדן פון פארשפרייטן פון דער 3-טער געזערד-לאטעריי. עס דארפן ברייט אויסגענוצט ווערן אלע ארטן פון סאצנועטע צווישן די ארגאניזאציעס. אונטערנעמונגען צווישן די לעמערלעך. ס'דארפן נענומען ווערן אפן בוקסיר די אָפּגעשטאָנענע, ס'דארפן פראקטיקירט ווערן אין דער שטאט-פארוואלטונג, דער ווערן אינדזיידערלע ארויסרופן. דער אינדזיידערלע ארויסרופן, אז אין דער לאטעריי-קאמפאניע דארף ווערן אָנגעזאגט אלע פון דער לאטעריי-קאמפאניע דארף ווערן אויפגעלייענט אין אלע פאבריקן, אין דער שפאלטן פון דער פרעסע, אין דער ראדיו, אין דער קינאָ, אין דער אויפגעלייענט אין אלע אויפגעלייענט אין אלע אויפגעלייענט אין אלע

Старэйшаму бальшавіку падпольшчыку, загартаванаму ў баёх чырвонаармейцу і правадыру Чырвонай арміі і флёту Кліму Варашылаву

Дарагі таварыш, Клім Варашылаў! У дзень твайго пяцідзесяцігадовага юбілею рабочыя акулярнай фабрыкі пасылаюць табе сваё гарачае пралетарскае прывітанне. У тваёй асобе мы вітаем нашу клясавую пралетарскую Чырвоную армію. Адначасова запэўніваем цябе ў сваёй гатоўнасьці да абароны кастрычніцкіх завёў. Твой 50 гадовы юбілей азнаменуем арганізацыйнай брыгады імя Кліма Варашылава і абвясьцім вайну з бракам, за выкананьне прамфінпляну.

Нахай жыве наша Чырвоная армія і яе палкаводзец Варашылаў!

Ад імя 1300 рабочых і служачых:

Парткалектыў, фабком Віцебскай акулярнай ф-кі

РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, МЯТЛА І БУРСЕВІЧ—у Віцебску

У Віцебск прыбылі былыя дэпутаты польскага сойму—члены беларускага клюбу Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсевіч. Яны былі на заводзе «Чырвоны Мэталіст», акулярнай фабрыцы і швэйнай фабрыцы „Прафінтэрн", дзе знаёміліся з вытворчасьцю і гутарылі з рабочымі аб становішчы ў Зах. Беларусі.

270 рублёў у карысьць МОПР'а

Учора на ф-цы «Дзьвіна» адбыўся мітынг рабочых 1-ай зьмены з удзелам знаходзячыхся ў Віцебску былых дэпутатаў польскага сойму Рак-Міхайлоўскага, Мятлы і Бурсевіча.

Пасьля мітынгу было сабрана 270 рублёў у карысьць МОПР'у.

Оліпаш.

ТЭЛЕГРАМЫ

Польшча рыхтуе вайну проці СССР

Па паведмленьнях нямецкіх газэт, Пілсудзкі па дарозе на востраў Мадэру, вёў у Парыжы перагаворы з прадстаўнікамі Францыі, Англіі аб арганізацыі антысавецкага блёку. Газэты паказваюць, што посьпехі пяцігодкі ўзмацнілі ў Польшчы варожасьць к СССР. У сувязі з гэтым, на ўсходняй мяжы Польшчы ўзмацнілася падрыхтоўка к вайне. Узводзяцца цытадэлевыя ўкраленьні, увозіцца новае аружжа з Францыі.

Пілсудзкі дабіваецца таго, каб уцягнуць у антысавецкі блёк акрамя Румыніі і Чэхаславакіі, яшчэ Літву і Вэнгрыю і прадахраніць сябе ад нападу Нямеччыны з тыла. Перагаворы Пілсудзкага ў Польшчы мелі мэтаю давесьці да ведама Нямеччыны, што Пілсудзкі хацеў бы забясьпечыць на выпадак польска-савецкай вайны дабражаданы нэйтралітэт Нямеччыны. Акрамя таго, Пілсудзкі хацеўбы, каб Нямеччына прапусьціла праз сваю тэрыторыю транспарты ваенных матар'ялаў. Пілсудзкі згодзен узнагарадзіць Нямеччыну частковым перагляданам польска - нямецкіх межаў.

Адкрытая варожасьць к СССР праявілася таксама ў спрэчках у польскім сойме па бюджэту ваеннага міністэрства. Усе прамоўцы зусім адкрыта гаварылі аб падрыхтоўцы вайны супроць СССР. Таварыш ваеннага міністра генэрал Канаржэўскі заявіў што бюджэт ваеннага міністэрства зьяўляецца супроцьвагай савецкай пяцігодцы.

Савецкі саюз і пан-эўрапейская камісія

Нарком замежных спраў т. Літвінаў атрымаў ад генэральнага сэкратара Ліг Нацый ліст аб тым, што камісія па вывучэньню пытаньня аб эўрапейскім саюзе запрашае савецкі ўрад прыняць удзел у работах камісіі, маючых мэтай вывучыць сусьветны эканамічны крызіс.

Савецкі ўрад у адказ на запрашэньне заяўляе, што, аддаючы сабе поўнае ўражаньне ва ўсёй той барацьбе, якая вядзецца вакол праэкту эўрапейскага саюзу, ён прымае запрашэньне, пакідаючы за сабой права альбо адмовіцца ад удзелу заразжа, альбо ў далейшым, калі ён упэўніцца, што мэты камісіі супярэчаць мэтам упрачненьня міру. Савецкі ўрад прымае запрашэньне таму, што ён усяляк імкнецца да ўмацаваньня ўсеагульнага міра і не дапусьціць абвяньць СССР у зрыве якіх-бы то ні было мірных імкненьняў. Савецкі ўрад ні на хвіліну сябе не ашуквае наконт сапраўдных замыслаў імпэрыялістых. Калі ён, аднак, прымае запрашэньне, дык для таго, каб разаблачыць гэтыя замыслы і паказаць працоўным усяго сьвету сапраўдны твар імпэрыялістых.

Падарунак рабочых Карагандзійскіх капальняў т. Сталіну

Першы эшалон каменнага вугальля

Па толькі што адкрытай чыгунцы Акмалінск—Караганда, з Караганды выйшаў першы эшалон вугаля (30 вагонаў) у падарунак т. Сталіну. Рабочыя Караганды пастанавілі абраць т. Сталіна пачэсным забойшчыкам і назваць яго імем адну з шахт.

Вялічэзная ў сьвеце тэлефонная лінія Уладзівасток—Масква

Пачата праводка ўсьцяж Амурскай чыгункі тэлефоннай лініі Хабараўск—Чыта. Даўжыня лініі 2415 кілёмэтраў. Гэтая лінія будзе адным з зьвеньняў вялічэзнай у сьвеце тэлефоннай лініі Масква—Уладзівасток.

За цкаваньне рабкоркі—5 год пазбаўленьня волі

9-га лютага адбыўся суд над Акаловічам і Васільлевым па абвінавачваньню іх у прасьледваньні і зьбіеньні рабкоркі ЦРК тав. Танхельсон.

Судовае сьледзтва поўнасьцю пацьвердзіла злачынную дзейнасьць Акаловіча і Васільлева і суд прыгаварыў: Акаловіча да 3 х год і Васільлева да 2 х год пазбаўленьня волі.

Работу жыльлёва - будаўнічых арганізацый пад рабочы кантроль

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ ДАМАЎЛАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ ЗЬДЗЕКВАЮЦЦА НАД РАБОЧЫМІ ЖЫЛЬЦАМІ

Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых

16-ты партэзьезд у рэзалюцыі па дакладу т. **Шаврыка** аб працы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд паказаў, што «рабочае жыльлёвае будаўніцтва, разгарнуўшаеся ў апошнія гады асабліва шырока (асыгнавана за апошнія два гады на рабоча - жыльлёвае будаўніцтва 1330000 р.), патрабуе ад прафсаюзаў значна большай увагі, чым гэтае было дагэтуль. Прафсаюзы павінны сачыць за правільным выдаткаваньнем сродкаў, асыгнуемых на жыльлёвае будаўніцтва і эфэктыўнасьцю іх скарыстаньня» (утаненьне жыльлёвага будаўніцтва, стандарт і г. д.).

Пашырэньне і ўтаненьне жыльлёвага будаўніцтва, разгортваньне будаўніцтва ў рабочых раёнах, ліквідацыя жыльлёвага крызісу—справа ня толькі прафсаюзаў, але і ўсёй рабочай грамадзкасьці.

На 70 справаздачна-перавыбарчых сходах гарсавету, а таксама і ў «Віцебскім Пралетары» адзначалася, што ў выніку адсутнасьці рабочага кантролю над працай жылбудаўнічых арганізацый, малай зацікаўленасьці ў гэтым прафсаюзаў Віцебску **пляны будаўніцтва недавыкананы.** Некалькі камунальных дамоў будуць гатовы для эксплёат цыі значна пазьней вызначанага тэрміну.

Надзвычайна важнай і неабходнай умовай для палепшаньня становішча існуючых дамоў, як камунальных, так і жакцтаўскіх, зьяўляецца рамонт гэтых дамоў, рамонт рабочых кватэр і г. д., але праўленьні шэрагу жакцтаў упарта адмаўляецца рамантаваць свае дамы, чым даводзяць іх да зруйнаваньня.

Жыльлёвы стол гарсавету працуе марудна, не па ўдарнаму, працаўнікі яго не пераключыліся на баявыя тэмпы працы.

Зьмяшчаемыя ніжэй матар'ялы сьведчаць аб тым, што жыльлёвыя арганізацыі парушаюць дырэктывы партыі і прафсаюзаў аб жыльлёвым будаўніцтве і працы дамавых арганізацый.

Адпаведныя арганізацыі павінны прыняць належныя меры да парушаючых савецкія законы і пастановы аб «палепшаньні бытавых і жыльлёвых умоў рабочых, як неабходнай умовы для ажыцьцяўленьня намечаных тэмпаў індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі».

Прыцягнуць да суровай адказнасьці зрываючых жыльлёвае будаўніцтва

У горадзе ёсьць шэраг дамоў, якія яшчэ ня скончаны абсталяваньнем. У гэтых дамох працуе ўсяго некалькі рабочых і праца праходзіць марудна. У дамох ня зроблены водаправод, няма атапіцельных труб і інш. Гэта асабліва прымячаецца ў доме чыгуначнікаў па Камсамольскай вуліцы, дзе, з-за несваечасовай заяўкі на арматуру для атапленьня, прышлося ламаць гатовыя перагародкі і ставіць жалезныя печы. На пакрыцьцё гэтых печак пайшло многа кравельнага жалеза, прад назначанага для пакрыцьця радам будуючагася другога корпусу.

Гаржылсаюз не сьпяшаецца са скончаньнем будаўніцтва сталовай ЦРК супроць заводу „Чырвоны Мэталіст", 4-га камунальнага дому і інш.

Больш паўгода, як будуецца ў памяшканьні былога лёмбарду сталовая ЦРК. Марудна праводзіцца праца, не сьпяшаюцца будаўнічыя арганізацыі. Такое становішча і з будаўніцтвам шэрагу камунальных дамоў. Рамонт дому каля вагзалу, дзе павінна быць сталоўка ЦРК і рамонт Біржы працы ня скончаны.

Неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на ход будаўніцтва і прыцягнуць да суровай адказнасьці зрываючых яго.

Н. Т.

Рабіновіч зьдзекваецца над жыхарамі

Уласьніца дому на Велікалуцкім тракце **Рабіновіч** зьяўляецца работнікам сталоўкі № 5 ЦРК. Яна зьдзекваецца над кватарантамі **Сістынымі**, якія жывуць у яе доме ў маленькім пакоі, плацячы за гэтую «кватэру» 7 рублёў. Рабіновіч дайшла да таго, што выганяе кватарантаў з дому, а нядаўна яна прымусіла 50 гадовага старыка чысьціць уборную. Гэта ўбачыла работніца панчошнай ф-кі, якая абурылася гэтым фактам. Сын уласьніцы дому—камсамолец Рабіновіч замест таго, каб рэагаваць па-камсамольскі на гэты выпадак з боку сваёй зарваўшайся мамашы, адказаў наступнае: «калі ты партыйная, дык ідзі жыць з партыйнымі, а табе тут няма месца».

Пракуратура павінна зацікавіцца гэтай гісторыяй.

Ведаючы.

Разбураюцца кватэры

Сем год жыве група рабочых у камунальным доме па Бальнічнай вул № 9. За гэты тэрмін камунадзел ні разу не зрабіў рамонту ў гэтых кватэрах, з-за чаго яны прышлі ў негоднасьць. У двух пакоях праваліліся столь і ўрэшце завіруха сарвала частку крышы. У гэтых кватэрах далей немагчыма жыць. Кватаранты зварочваліся ў гарсавет і ў праўленьне жакту, але нічога не дапамагала. Камунадзел прыслаў паперку жакту, каб ён зрабіў рамонт, але праўленьне жакту на гэта не зварочвае ніякай увагі.

Пракуратура павінна зрабіць з гэтых фактаў адпаведныя вынікі.

Пяць подпісаў.

Неабходна ўмяшацца пракуратуры

У жакце № 6 па Валадарскай вул. № 40 пражываюць тры рабочых сямі ў адной кватэры. Печка ў кухні награжае абвалам, і колькі рабочых не зварочваліся ў жакт з просьбай аб рамонце, праўленьне жакту нічога ня робіць. Урэшце, праўленьне жакту паслала рабочых, якія разабралі печ і... вось ужо пяць месяцаў, як яна ляжыць разбураная. У пакоях холад і дзеці хварэюць. Праўленьне жакту корміць рабочых «заўтракамі» пяць месяцаў.

Бюракраты не жадаюць лічыцца з патрабаваньнямі рабочых. Неабходна ўмяшаньства пракуратуры ў справы жакту № 6.

Зіхерман.

Спыніць зьдзекі над работніцай

Работніца валасапрадзільнай фабрыкі **Якушава** С. жыве са сваёй сям'ёй у камунальным доме па Валадарскай вул. № 27|17, дзе займае адзін сыры пакой, які знаходзіцца радам з ваннай. Ужо 16 месяцаў, як яна просіць даць ёй кватэру. РСІ аддала распараджэньне абсьледваць становішча Якушавай, але гэта не дапамагло. Не дапамагло і тое, што ўрачы параілі адпаведным арганізацыям прадаставіць хворай работніцы кватэру.

Урэшце, 6-га лістапада ЦВК БССР прапанаваў віцебскаму гарсавету прадаставіць Якушавай кватэру, але зноў няма ніякіх вынікаў.

Мы патрабуем ад адпаведных арганізацый прыняць меры да бюракратаў, якія не жадаюць лічыцца з пастановамі цэнтральных арганізацый.

Мацьвееў.

Прымусіць Зайцаву зрабіць рамонт

Па Канатнай вул. № 69 пражывае дамаўласьніца лішэнка **Зайцава**, якая мае тры дамы і зьдзекваецца над жыхарамі. Атрымліваючы акуратна грошы за кватэры, яна адмаўляецца рабіць рамонт. 6-га сьнежня ў карыдоры дому праламілася падлога, праходзячы рабочы праваліўся ў падвал і пабіў сабе руку і бок.

Трэба прымусіць зарваўшуюся дамаўласьніцу зрабіць рамонт у рабочых кватэрах.

Юхневец.

Багданаў самадурствуе

Тав. В. атрымаў ордэр на кватэру па Ніжне Пятроўскай вул. № 34, але старшыня жакту № 11 **Багданаў**—член Гарсавету адмовіўся выдаць ключы для заняцьця кватэры, сказаўшы наступнае: «для мяне старшыня Гарсавету не начальства, дайце мне рэзалюцыю старшыні жылсаюзу, тады я дам ключы".

Яўсееў.

Прымеце меры

Уласьнік дому па Смаленскаму шасе № 72 кулак **Грышчанка**, які мае тры каровы, аднаго каня і гандлюе прадуктамі сельска-гаспадарчага вырабу на рынку, зьдзекваецца над жыхаром **Бялецкім**, які жыве ў яго доме. Кулак Грышчанка неаднаразова пагражаў забіць Бялецкага. Трэба супакоіць Грышчанка.

Першыя арганізацыйныя паседжаньні сэкцый гарадзкога савету

Сёньня, а 7-й гадз. увеч. адбудуцца паседжаньні наступных сэкцый Гарсавету:

Прамысловай — у памяшканьні клюбу мэталістых.

Сельсна гаспадарчай—у памяшканьні Дому селяніна.

Нарасьветы—у памяшканьні Дому асьветы.

Гандлёва - кавпэрацыйнай — у памяшканьні клюбу «Прафінтэрн».

Бытавой—у памяшканьні клюбу будаўнікоў (Валадарская).

Грашовай—у памяшканьні Гарсавету (пакой № 22).

Паседжаньні фракцый гэтых сэкцый адбудуцца ў тых-жа памяшканьнях а 6 й гадз. увеч.

12 га лютага, а 7-й гадз. увеч. адбудуцца паседжаньні наступных сэкцый Гарсавету:

РСІ—у клюбе швэйнікаў.

Вайсковай—у Доме Чырвонай арміі.

Камунальнай—у клюбе камунальнікаў (Плошча свабоды).

Аховы здароўя—у клюбе мэдсантруд (Замкавая).

Працы і запясьпені — у клюбе саматужнікаў (Валадарская 26).

Адміністрацыйна прававой — у клюбе сувязі (Ленінская).

Паседжаньні фракцый гэтых сэкцый адбудуцца ў гэтых-жа памяшканьнях а 6-й гадз. увеч.

Усім фэбзаўмясцкомам трэба абвясьціць усіх дэпутатаў, кандыдатаў Гарсавету і вылучаны рабочы актыў для работы ў Гарсавеце аб часе і месцы першага арганізацыйнага паседжаньня сэкцый Гарсавету.

Штаб штурму па ліквідацыі прарыву ў ільнозагатоўках

Пры гарРСІ створаны штаб штурму па ліквідацыі прарыву ў ільнозагатоўках з прадстаўнікоў гарКК—РСІ—т. Вензел» (старшыня штабу), ЦКК—РСІ т. Цырлін, гар рафсавету Наралёў, тэкстыльнаб'ядзіньня—Вульфсон, рэдакцыі «Зьвязда»—Брайнін. Арганізаваны 18 брыгад з партыйнага і прафактыву ў колькасьці 80 асоб, якія пасьля дэтальнага інструктажа выехалі ў раёны.

Выклікаюцца ў ГарКК

Выклікаюцца на паседжаньне п-тройкі Гар. КК КП(б)Б на 12 га лютага, а 6 гадзін увечары (Замкавая 26), па разгляду партспраў і апэляцый наступныя т. т.:

Трэцьякоў П. яч нарэчаваньня.
Валасач Н. яч. воднікаў.
Пятрова А. І. яч скурааводу.
Шчалкалі Д. А. яч. „
Радчэнка П. К. яч. гарміліцыі.
Міхаўлаў яч. гарміліцыі
Найман яч. рабфаку.
Шэракоў М. М. яч. дрожзаводу.
Сакалоў А. Н. 3 я ф-ка віцшвэя.
Левашоў Н. Н яч. шляхбудаўнічага вучастку.
Горэр Э. Ф. яч. валасапрадзільнай фабрыкі.
Коткіна яч. валасапрадзільнай ф кі
Сандлер яч. валасапрадзільнай ф кі
Іваноў А. І. дэмабілізаваны чырвонаармеец.
Самцоў К А. яч. уцількож
Сінькоў яч. 2-й ф-кі віцшвэя.
Сурыкаў Я. Н. яч. віцкамтрэсту.
Дзьмітрыеў Н П. яч. віцкамтрэсту
Хадарэнка Л. І. яч. віцкамтрэсту
Камароў яч. алейнага заводу.
Сарахонаў яч. алейнага заводу.
Гуткін Г. яч. пабудовы панчошнай фабрыкі.
Макавеяў І. К. яч. заводу «Чырвоны Мэталіст».
Палячонка П. яч. зав. «Чырвоны Мэталіст».
Багдановіч яч. войлачнікаў.
Арлоў яч. войлачнікаў.
Фойцік яч. гарсавету.
Шкрабакоў яч. палітэхнікум.
Хадасевіч яч. палітэхнікум
Крумкач яч. каапэрацыйнага тэхнікуму.
Даніман яч. будаўнікоў.

Прапануецца ўсім сакратарам ячэек у яких састаяць на вучоце пераліченыя т. т., паведаміць апошніх аб яўцы на паседжаньне КК і таксама ў абавязковым парадку зьявіцца самім.

Н. Э. Грынберг

Раптоўна памёр у час работы старыя рабочы-падпольшчык, член партыі з 1905 году т. Грынберг Мікола Эрманавіч. Да апошніх дзён т. Грынберг не пакідаў свайго варштату, нягледзячы на свой пажылы ўзрост —59 год. Тав. Грынберг, працуючы на вадакачцы ў якасьці памоцніка машыністага, быў першым ударнікам і паказваў прыклады самаўпраўнай бальшавіцкай працы.

Лепшым помнікам памёршаму старому бальшавіку-падпольшчыку з боку рабочых будзе яшчэ больш упартая барацьба за перавыкананьне прамфінпляну, за бальшавіцкія тэмпы выкананьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сход рабкораў, загодчыкаў прыгародных гаспадарак і сельска-гаспадарчага аддзелу ЦРК

Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 25), склікаецца агульны сход рабкораў гораду, супольна з загадчыкамі прыгарадных гаспадарак, саўгасным актывам і працаўнікамі сельска-гаспадарчага аддзелу ЦРК па пытаньню вясновай сяўбы ў прыгарадных гаспадарках, удзелу рабкораў і дапамогі пралетарскага гораду.

Паседжаньне штабу па буксіру над чыгункай

11 га лютага, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні гаркому КП(б)Б—габінэт сэкратара, адбудзецца паседжаньне штабу па буксіру над чыгункай.

Сэкратарам ячэек і калектываў для работы па буксіру над чыгункай вылучыць: «Прафінтэрн І»—8 партыйцаў, панчошнай фабрыкі—5 «Чырвоны Мэталіст» 8, акулярная ф-ка—5, ф-ка «Лекерта»—5, ф-ка «Дзьвіна»—5 камтрэст—5, гаржылсаюз—3, «Камінтэрн І»—5, Гарсавет—3, судустаноў—6, шчаціная ф-ка—4, «Прагрэс»—2, рэдакцыі «Віцебскі Пралетарь»—3, гарком КСМ—7 партыйцаў-камсамольцаў.

Сэкратарам ячэек забясьпечыць яўку вылучаных таварышоў на гэтае паседжаньне.

Навуковая асацыяцыя мэдработнікаў

Сёньня, 11 га лютага, у 8½ г. увечары, у памяшканьні клюбу «Мэдработнікаў» (Замкавая 5), адбудзецца **агульны сход навуковай асацыяцыі мэдработнікаў**

Абвестка дня: «Аб асновах рацыянальнага харчаваньня» (даклад д-ра Шэйніна), «Становішча грамадзкага харчаваньня ў Віцебску» (даклад д-ра Белкіна), бягучыя справы.

Запрашаюцца работнікі ЦРК і нархарчу.

Праўленьне асацыяцыі.

173—1—1

Да ведама саматужнікаў і сябраў арцеляў гор. Віцебску

Пры клюбе саматужнікаў «Чырвоны Кастрычнік» арганізоўваецца **літаратурны гурток на эўрэйскай мове.**

Жадаючыя прыняць удзел у гуртку, могуць запісацца штодзённа ў бібліятэкара з 7 да 10 гадзін увечары.

Праўленьне клюбу.

За рэдактара
Н. І. Баруноў.

Гарком КП(б)Б з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці старога партыйца падпольшчыка

т. Н. Э. ГРЫНБЕРГА.

Пахаваньне адбудзецца сёньня, 11-га лютага. Вынас цела з клюбу камтрэсту, а 4 й гадзіне дня.

Партыйная ячэйка, РКГ і камтрэст з жалем паведамляюць аб сьмерці старога бальшавіка

т. Н. Э. ГРЫНБЕРГА.

Пахаваньне адбудзецца сёньня, 11-га лютага.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Першы беларускі Дзяржаўны тэатр.

Сёньня, у сераду, 11-га лютага,

ГУТА ў 3-х дзеях.

Пач. а 8 гадз. увеч. Білеты—ў касе тэатру.

БЕЛДЗЯРЖКІНО 8 кінаэкраны, 9-га лютага

СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. Па Шолам-Алейхему **Яўрэйское шчасьце**

МАСТАЦКІ Пач. 1-га сэанс. а 6 гадз. увеч. Замежная камэдыя **Унучак бабкі** у гал. ролі Гарольд Ллойд. Звыш праграмы **Насустрэч трэцяму**

ПРАЛЕТКІНО Пач. 1-га сэансу роўна а 1 гадз. увеч. ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ **Жалезны авангард**

У ПРАЛЕТКІНО штодзённа ідзе ДЗЁННЫ КІНО-СЭАНС для рабочых вячэрніх зьмен **Жалезны авангард** Пачатак а 12 гадз. 30 хвілін дню. Кошт білетаў 30 кап. і 25 кап.

ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР імя Макса Гельца ў памяшканьні ПРАЛЕТКІНО **БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС** Толькі 1 сэанс. Пач. а 4 гадз. дню.

Таварыства „Прыхільнікі дзяцей" заўтра, 12 га лютага, а 6 гадз. увеч., у Палацы працы (пакой № 25), склікае **агульна-гарадзкую канфэрэнцыю былых выхаванцоў дзіцячых домоў і былых бясспрытульных,** зараз працуючых на вытворчасьці.

Запрашаюцца прадстаўнікі адміністрацыі фабзаўкомаў, ячэек ЛКСМ і ячэек т-ва «Прыхільнікі дзяцей» тых прадпрыемстваў і навучальных устаноў, у якіх бясспрытульныя працуюць.

Пасьля работы канфэрэнцыі—**наведваньне цырку.**

175—2—1

Кіраўніцтва ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ „СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" даводзіць да ўсеагульнага ведама аб тым, што ў зьвязку з арганізацыйнымі перыядам да 15-га сакавіка г. г. **ніякія экскурсіі на фабрыку дапушчацца ня будуць.**

Дырэкцыя фабрыкі.

172—2—1

ГАРТЭАТР Спэктаклі дзяржаўнага тэатра музыкамэдыі і кінопэры.

Сёньня, у сераду, 11-га лютага,

КІРМАШ НЯВЕСТ музыкамэдыя ў 3-х дзеях, муз. Якобі.

Пачатак а 8 гадз. увеч. Білеты ў касе тэатра.

ЦЫРК (т-ва «Прыхільнікі дзяцей»)

Сёньня, у сераду, 11 га лютага,

НОВАЯ ПРАГРАМА

ГАСТРОЛІ зноў прыбыўшых артыстых: 3 ДАНЕМАН, ВОЛЬДЭМАРС і СЕРЖ, ЛЕОН і П'ЕР, 2 ДУКЛАСС, ФЁДАР МАРОЗАЎ, 8 ПАЎЛАВЫХ, В. КОЛАСАВА і А. ЛАРСКАЯ.

Канфэрансье І. В. Лебедзеў (дзядзя Ваня).

Пач. а 8 гадз. увечары.

Па калектыўных заяўках скідка 35%

ПРАВЛЕНІЮ АРТЕЛИ „КООПРЕМОНТ" **ТРЕБУЮТСЯ ЛИЦА,** знакомые с РАБОТОЙ **ПО ПОЧИНКЕ ГАЛОШ**

Обращаться в правление артели, Рыночная ул., дом № 3.

145—5—4

ТЕЛЕГРАММА

СРОЧНО ВИТЕБСК ЦИРК

СНЕЖНЫЕ ЗАНОСЫ ЗАДЕРЖАЛИ МЕНЯ ПЕРМИ
СИЖУ ДВОЕ СУТОК УТРОМ ВЫЕЗЖАЮ НАЧНУ
ДВЕНАДЦАТАГО ИЛИ ТРИНАДЦАТАГО

ВИТАЛИЙ ЛАЗАРЭНКО

Украдена печать завкома металлистов, центральной электростанции «Водосвет» (круглая), каковую считать недействительной.

174—1—1

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі

Па горэду:

Пропуск панчошнай фабрыкі № 2697 І. М. Рэўф 11758
Пропуск панчошнай фабрыкі А. А. Сергач 11759
Даведка аб бязпрыз., выд. Котаўскім с. с. і даведка аб разводзе Е. І. Кузьняцовай 11762
Вайсковы білет М. М. Шэрмана 11757
Справка аб гадавым стажы, выд. саматужн Селязьнёвым праж. у вёсцы Стральова—Е. І. Кузьняцова 11763
Мэтрыка Е. М. Анушанка 11764
Вайсковая кніжка М. А. Афанасьева 11765
Атэстат выд. ЦІП'ам Л. Н. Бейлінсона 11766
Пасьведчаньне асабовасьці Пальмінскага с. с. А. Ф. Ганчаровай 11767
Сяброўская кніжка саюзу будаўнікоў № 6/44460 П. Ф. Панкова 11768
Мэтрыка Е. Г. Мухіна 11769
Заборная кніжка ЦРК М. І Мільнера 11770
Кандыдацкая картка КП(б)Б № 39057 Г. І Савіцкага 11771
Сяброўская кніжка саюзу мэталістых Н. П. Фадзеенка 1177
Пасьведчаньне асабовасьці выд Віц. с. с. А. С. Бяляева 1177
Даведка аб рэгістрацыі, выд. Віцебскім Загсам А. С. Бяляева 1177
Камсамольскі білет А. П. Сяргеевай 1177
Пропуск панчошнай фабрыкі № 1109 М. І. Арынгевіч 1177
Пропуск панчошнай фабрыкі № 330 Р. З. Бадхан 1177
Паявая кніжка ЦРК, заборная і хлебныя карткі Е. І. Громавай 1177
Пропуск панчошнай фабрыкі № 2283 А. Д. Парковай 1177
Паявая і заборная кніжкі, выд. Гарадоцкім О. П. Х. В. Паташынскага 1177

Выгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрна», Бальшавіцкая, 10. Тыраж 10.000